ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЯ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 110 (492) Субота, 1 кастрычніка 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню У АЎТОРАК, ЧАЦЬВЕР І СУБОТУ | ГОД ВЫД. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

Працягваем усебеларускі мітынг!

Уцягнуць ня толькі комсамольцаў

(Прамова прадстаўніка рэдакцыі „Чырвоная Зьмена“

Практыка паказала, што на многіх прадпрыемствах моладзь, без дапамогі дарослых рабочых, асабліва вялікай работы ня зробіць.

Між тым, для нас вельмі важны МАТАР'ЯЛЬНЫ посьпех суботніка. На „чорнай“, не кваліфікаванай рабоце многа грошай не заробіш.

З гэтай прычыны ва ўсю шырыню паўстае пытаньне аб уцягненьні ў суботнік ня толькі астатняй беспартыйнай моладзі, але і дарослых рабочых.

Зразумела, што аб ніякім прымусу дарослых рабочых у парадку якіх бы то небудзь дысцыплін, ня можа быць і гутаркі. Справа ідзе аб стварэньні на прадпрыемствах, у саўхозах і вёсках спрыяючай да суботніку“ грамадзкай думкі.

Для добраахвотнага ўцягненьня рабочых, карысна прыцягнуць сяброў існуючых гурткоў „Прыхільнікаў Дзяцей“.

Комсамольскія ячэйкі, сумесна з гэтымі гурткамі, павінны правесьці шырокую кампанію па растлумачэньню як індывідуальным парадкам, гэтак і праз насьценную газэту і агульны сход, становішча бяспрытульных і аб мэце ўсебеларускага суботніка. Толькі пры ўмове папярэдняга грунтоўнага растлумачэньня можна будзе забясьпечыць у частцы прадпрыемстваў удзел ня толькі моладзі, але і астатніх рабочых.

Зараз, таксама, патрэбна ЗАБІЦЬ ТРЫВОГУ наконт таго, што некаторыя ячэйкі, ня гледзячы на досыць зразумелыя паказаньні, не ўявілі сабе неабходнасьць забясьпекі абавязковай масавасьці суботніка. Некаторыя ячэйкі абмяжоўваюцца только тым, што прыцягваюць комсамольцаў. Гэта, зараз, ў 1927-ым годзе, не асабліва вялікае ўменьне.

Уменьне у тым, каб прыцягнуць усю працоўную моладзь, каб зрабіць комсамольскую ячэйку організатарам, застрэльшчыкам „суботніка“. Гэта—найпершая ўмова для добрага правядзеньня „суботніка“.

Ячэйкі, якія ўважліва сочаць за „усебеларускім мітынгам“ маюць магчымасьць скарыстаць шмат карысных прыкладаў, якія адзначаюцца таварышамі ў прамовах. Наш „мітынг“ зрабіў значную работу, сгуртавай увагу комсамольскіх організацый на важнасьці „вялікага пачыну“—суботніка.

Трэба спадзявацца, што ўсе комсамольскія ячэйкі добра ўцямяць і важнасьць найбольшай масавасьці суботніка.

Ячэйкі пачалі рыхтавацца.

Большасьць будзе працаваць на некваліфікаванай рабоце.

Завод „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“,

Ня так даўно пытаньне аб суботніку стаяла на сходзе. Сход прайшоў вельмі актыўна. Выказаліся ў спрэчках, амаль палова ўсей ячэйкі. Гаварылі, што цяжка стаць на **кваліфікаваную работу**, бо ячэйка малая (30 асоб) большасьць—**некваліфікаваныя.**

Гавырылі, што шмат работы па ачыстцы памяшканьня.

І хлопцаў з цукернай фабрыкі (ячэйка яднае два прадпрыемствы) можна будзе скарыстаць на гэтай рабоце.

Маленькая частка ячэйкі будзе працаваць на сваёй кваліфікаванай рабоце, бязумоўна, пры дапамозе партыйцаў.

Суботнік пр цягнецца цэлы тыдзень, кожны будзе атрабатваць у сваю зьмену.

Завод „МЭТАЛЬ“.

У ячэйцы 40 чалавек. Пытаньне аб суботніку ўжо абгаварвалі на бюро. Беспартыйная моладзь бязумоўна прыме ўдзел. Думаюць, што выйдзе ў суботнік ўсяго каля 50 чал.

Работаць будуць па ачыстцы двара.

На кваліфікаваную работу стаць нельга, бо ўсяго кваліфікаванай моладзі некалькі чалавек.

БОЙНЯ.

Ячэйка ў адну з субот выйдзе працаваць, бо на прадпрыемстве выхадны дзень якраз субота.

Усяго комсамольцаў 18 чалавек. Есьць шмат моладзі часова працуючай.

Работы шмат, але як і ва ўсіх ячэйках, работа **некваліфікаваная**. Усё-ж такі **частка будзе працаваць на прадпрыемстве**, астатнія **па ачыстцы двара.**

Прыме ўдзел 100 хлапцоў

(Ячэйка сельска-гаспадарчых і будаўнічых клясаў)

Ячэйка дае 100 хлапцоў, якія могуць добра працаваць.

40 беспартыйных ужо далі сваю згоду на ўдзел у «суботніку».

Хлопцы не чакалі пакуль ім дадуць работу а пачалі самі яе вышукваць. Бюро ўважліва сачыла за кожнай прамовай на мітынгу, каб знайсьці што-небудзь падхадзячае да умоў ячэйкі.

Парашылі заняцца работамі ў бліжэйшым саўхозе, капаць і адвозіць бульбу. Згаварыліся з Белсельтрэстам, які ахвотна прадастаўле работы.

10 кастрычніка ячэйка выйдзе працаваць.

Наступны сход ячэйкі будзе цалком прысьвечаны таму, што і як будзе кожны рабіць.

Слова за моладзьдзю.

Прамова т. Штэйнэра.

(Старшыня праўленьня «Белшчаціны»).

Таварышы!

Мы на нашых прадпрыемствах абяцаем усялякую падтрымку суботніку.

Наша моладзь кваліфікавана. Гэта дасьць ёй магчымасьць асобна ад астатніх рабочых працаваць у суботнік.

Наш цыркуляр, які друкуецца у гэтым нумары газэты, палегчыць організацыю суботніка на фабрыках.

Праўленьне робіць усё магчымае, каб суботнік прайшоў добра. Мы дадзім **сырэц і некаторую добра кваліфікаваную тэхнічную сілу.**

Застаецца, таварышы комсамольцы, справа за вамі. Дакажэце, што вы зможаце добра папрацаваць і дапамагчы бяспрытульным.

Мы будзем працаваць на кваліфікаванай рабоце.

Прамова т. Шымаоўскага.

(Рабочы ЦІП'а).

Гэтымі днямі адбудзецца пасяджэньне бюро нашай ячэйкі. Бюро абгаворыць пытаньні правядзеньня суботніку на курсах.

А пакуль мы ўжо правялі вялікую работу.

Дагаворана з адміністрацыяй наконт «суботніку». Сьлесары і кавалі працуюць на сваёй **кваліфікаванай рабоце**, кожны выбярэ якую-небудзь **работу** і будзе работаць, пакуль ня скончыць.

Сталяры будуць працаваць на пабудове новага памяшканьня школы.

Загадчык т. **Саўко** ўсімі сіламі ідзе насустрач, ён яшчэ прапануе работу па адрамантаваньню ў сьлясарным цэху ціскоў.

У суботнік у нас выйдзе работаць адных толькі комсамольцаў **60 ч.** Справа бліжэйшых дзён пакажа колькі пойдзе і беспартыйных.

Вось пакуль усё тое, што мы зрабілі.

Як трэба рыхтаваць суботнік.

Бярэце прыклад з бабруйчан.

(Прамова таварыша Гершмана).

Да таго, што сказаў папярэдні прамоўца товарыш Янмульскі, я лічу патрэбным дадаць яшчэ некалькі фактаў.

— Усёй рабоце па суботніку мы надалі выключна ўдарны характар. Пытаньне было прапрацована на пашыраным пленуме акругавага камітэту. Акрамя гэтага папулярызацыя суботніка праведзена ва ўсёй організацыі.

Рагачоў. Прапрацавана на пленуме пытаньне. Праведзена нарада гаспадароў, дзе практычна вырашылі, што ўсе комсамольцы гораду і дарослыя піонэры будуць працаваць. Дагаворана і з савецкімі гаспадаркамі таксама ў гэтым напрамку.

МЕНСКІЯ СКУРАНЫЯ ЗАВОДЫ.

У справе правядзеньня суботніку аб'яднаюцца ячэйкі ФЗВ і заводаў.

Змогуць папрацаваць толькі ў ФЗВ. На заводах нельга, моладзі мала, і калі ёсьць, дык усе на падсобнай рабоце.

Гэтымі днямі бюро зоймецца выпрацоўкай падрабязнага пляну ўдзелу.

Бяспрытульныя на мітынгу.

Што сказалі 8 чалавек.

У пакоі было восем хлапцоў.

Яны сядзелі на брудных нарах, цесна зьбіўшыся ў кучу, грэючы адзін аднаго цяплом сваіх брудных цел.

Ужо вечарэла...

Вецер за шыбаю бразкаў адарванаю недзе бляхаю, і яго шалёныя парывы прыносілі ў камэру халодныя пырскі дажджу.

Хлопцы недаверліва глядзелі. Слухалі маркотна зьвесіўшы галовы.

— Ладна, калі ня хлусіш, дык добра,—сказаў **Мішка Карпоўскі** па мянюшцы «Смэрдэль» —ну, глядзі, чакаць будзем.

Мішцы «Смэрдэлю»—15 год. З 1925 году ён пайшоў гуляць. А яшчэ у 1919 завёз бацьку на могілкі, у 1924 побач з бацькам на тых-жа Берастоўскіх могілках (Смаленшчына) пахаваў і матку.

Мішка першы за усіх сказаў:

— Ну і што,—згаджуся. Работа гэта... Я работу паважаю.

Мішка, зьбіваючыся і сьпяшаючы тлумачыць мне, што калі пойдзе працаваць частка, то пойдзе і астатняя «шпана». А «шпана» разварушылася... 8-міга давую хэўру дзівіць само слова **«суботнік».**

— Суб-о-о-тнік!

Паўтараючы, расьцягваючы, гаворыць **Сашка Булатаў**, пабліскваючы чорнымі кропкамі вочаў.

— Пайду! Далі-бог, пайду!

Сашка з Екацерынаславу, і таму з «Екацерынаславу», што пяць год Сашка ня быў у ім, і тады ён лічыўся не Сталінград а іменна «Екацерынаслаў». У Сашкі галава—пакінуты пустыр, жорсткія валасы тырчаць ва ўсе бакі. І ўхмыляючыся, сьмяецца Сашка:

— Я то пайду. Але-ж ты зрабі так, каб і тыя з «малін» пайшлі,—гаворыць ён мне—пазаўчора мяне ня пусьцілі, кажуць малы, ты вось пайдзі туды на бальшак за вакзал ваш, як хаткі канчаюцца, дом будзе стары, на страсе яны і хаваюцца...

Лашкевіч, як яго паважна клічуць „дзядзька Хведар“, зусім не падобен да бяспрытульнага і стаў ён ім:

— Ня дужа даўно,—як ён гаворыць.

«Дзядзька Хведар»— полацкі селяні. Бацька памёр. Маткі сваёй ня бачыў. Вандраваў толькі ў «межах Беларусі». У Менску — тры месяцы. Раней жыў... па «хведараваму» ня жыў.

— А шляўся...

Хведар працаваць будзе. Працу любіць. У Менску нават тыдзень гандлярцы гной вазіў дарма,—не заплаціла. Зараз Хведар разам з пракурорам Вышэйшага Суду Рэспублікі заняты расьсьледваньнем гэтай абкружыўшай яго павуцінай гандляркі.

Яшчэ тры чалавекі ў камэры. Усё больш „сяляне“.

Я разьвітваюся. Хлопцы на ростань кажуць:

— Запішы, глядзі, толькі праўду, няхай адзенуць і шамаць дадуць. А работаць будзем. Холадна нам, сам бачыш.. Просім запішы, няхай адзежку дадуць..

Усё.

Дзьверы пакою зачыніліся. Дзяжурны праводзіў мяне да выхаду...

Я вышаў на вуліцу. Імгліў дождж... У перадзе расплываліся жоўтыя ліхтары. А ў галаве мітусілася «глядзі, запішы толькі праўду, няхай адзенуць і шамаць дадуць!».

Ал. Каліта.

Што зробяць у суботнік чырвонаармейцы.

Прамова т. Шульмана.

(Чырвонаармеец 7 роты №-скага палка).

Таварышы!

Грамадзянскія ячэйкі бязумоўна будуць працаваць у суботнік. Але ніводзін з прамоўцаў не закрануў пытаньня, што будуць рабіць у суботнік вайсковыя комсамольцы.

Мы не павінны гаварыць, што вайсковыя ня змогуць удзельнічаць. Працу можна і трэба знайсьці.

Таварышы! Але не знасьці будзе вельмі цяжка. Становішча чырвонаармейца ня дазволіць працаваць разам з іншымі на работах.

Праца павінна быць такая, якая дала-б магчымасьць удзельнічаць усім чырвонаармейцам і была-б пасільна ім.

Я прапаную вось што: наладзіць сваім сяброўскім ячэйкам вайсковыя куткі, і наогул пасунуць на крок уперад вайсковую працу. Грамадзянскія-ж ячэйкі павінны і нам дапамагчы, падшукаць памяшканьне, зрабіць што можна, каб гэтыя куткі нашага вайсковага суботніку былі добрыя.

Гэта адна з прапаноў. Няхай мае таварышы ўнясуць яшчэ некалькі прапаноў, як высьвятляць наш чырвонаармейскі ўдзел.

Работа павінна быць лепш штодзённай.

Прамова тав. Вайтэнкава.

(Старшыня ЦП Саюзу сельска-гаспадарчых рабочых).

Мы наладжваем у адзін з бліжэйшых нерабочых дзён (**ад 2-га да 9-га кастрычніка**) суботнік для комсамольцаў на сельска-гаспадарчых работах, як: капаньне бульбы, караньплодаў, малацьба ды інш. Работы прызначаюцца па ўзгадненьню з адміністрацыяй саўхозу.

Вядома, **пажадана, каб сумесна з комсамольцамі прынялі ўдзел у суботніку астатнія рабочыя і служачыя саўхозу, а на такіх работах, як малацьба, нават неабходзен удзел больш кваліфікаваных сіл.**

Аплата за работу ў часе суботніка будзе саўхозамі праведзена ў ардынарным разьмеры за прапрацаваны час па сярэдняй месячнай стаўцы, а таксама згодна колектыўнай умовы.

Кіраўнікам саўхозаў, сумесна з рабачкомамі, належыць весьці вучот работы прабленай у часе суботніка, каб можна было вывесьці заключэньне, наколькі мэтазгодна яна праведзена.

Якасна праца, праробленая ў суботнік, павінна быць праведзена лепш за штодзённую. Удзельнікі суботніку, бязумоўна, павінны выканаць існуючыя нормы выпрацоўкі.

Аб мандатах і мёртвых душах.

Чаму з 24-ох комсамольцаў працуюць адзінкі.

НАГРУЗКА НЕ ДАЕ „ДЫХНУЦЬ“ ГОРСАВЕТЧЫКАМ.

Мандат і сапраўдная праца.

Менскія комсамольцы ў Горсавеце.

Тав. Пасынкоўскі—сэкратар Менскага горсавету падняў галаву і зьдзіўлена на мяне паглядзеў.

— Вы хочаце ведаць, як работаюць комсамольцы? **Дрэнна!**

Больш гаварыць тав. Пасынкоўскі не хацеў. Паўгадзіны я абараняў 24 комсамольцаў-горсаветчыкаў ад няправільных, як мнэ здавалася, нападкаў сэкратара.

— Ну, паглядзеце самі, агульнае ўражаньне застаецца такое, што нічога ніхто з іх ня робіць.

— Прычыны?

— Іх шмат. Тав. Пасынкоўскі, так шчыра і заўзята нападаўшы на горсаветчыкаў, нарэшце, абараняе іх. Ён гаворыць, што

мы паслалі тых, хто ня можа работаць.

Чаму? Няўжо моладзь, прадпрыемствы, ячэйкі памыліліся? Няўжо мы паслалі самых дрэнных хлапцоў? Не. Пасланы былі самыя лепшыя і сталыя хлапцы, але тыя, хто загружаны быў штодзённай ячэйковай, профсаюзнай, партыйнай і іншай працай. Вялікі процант дэпутатаў таксама складаюць чырвонаармейцы. Улетку яны былі ў лягерах—не работалі. Узімку таксама ня будуць работаць дзякуючы палкавой нагрузцы.

Трэ было высоўваць дэпутатаў незагружаных альбо разгрузіць іх у ячэйках і прадпрыемствах ад іншай працы. Даць чырвонаармейцам магчымасьць прыняць хоць невялічкі ўдзел у працы горсавету.

Усё-ж ёсьць хлапцы працуючыя. Тав. Пасынкоўскі згодзен, што адзінкі маюцца, але толькі застаюцца адзінкамі.

Нахілюўшыся над прэйс-курантам.

У кампаніі правядзеньня зьніжэньня цэн, Менскі горсавет прыняў вялікі ўдзел.

А калі гаварыць аб гарсавеце і аб зьніжэньні цэн, дык неабходна сказаць і пра **Язьмір — комсамолку, работніцу з Меншвею.**

У сваей гандлёва-кооператыўнай сэкцыі **Язьмір** лепшая працаўніца. Сэкцыя наладзіла абсьледваньне розьнічных цэн. Язьмір былі даручаны самыя буйныя кооператывы.

Яна ўстанавіла, што розьніца паміж прэйс-курантамі і накладнымі дасылаемымі з праўленьня МЦРК—вельмі вялікія. Яна ўстанавіла шэраг іншых недахопаў, якія былі зьнішчаны праўленьнем МЦРК.

З мандатам—па конках і больш нічога.

У сэкцыі социяльнай забясьпекі—некалькі комсамольцаў. Вось тав. **Іваноў** дык зусім не наведвае сходаў. Ён нават на запытаньне сэкцыі нічога не адказвае. **Быў толькі тав. Іваноў на першым урачыстым сходзе. Атрымаў мандацік і стаў на конках разьяжджаць па вуліцах Менску.** Вось і праца ўся. 4 месяцы сэкцыя яго ня бачыць.

Таксама і тав. **Антыпаў** у сэкцыі фінансава-падатковай. Ён атрымаў мандат і ні разу ня быў у сэкцыі.

За абсьледваньнем пральні.

Сэкцыя РСІ атрымала весткі, што становішча першай пральні надта дрэннае. Дрэнна ў пральні з справаздачай, дрэнна з якасьцю прадукцыі: бялізну адпушчаюць у плямах, парваную і г. д. Абсьледваць пральню даручылі **Палтэр Фруме.** Доўга і старанна вышуквала Фрума прычыны недахопаў. Нарэшце знайшла. А праз тыдзень **недахопы былі зьнішчаны.**

На барацьбу з протэкцыянізмам

Вось комсамолка-горсаветчыца тав. **Райхэльсон.** Сэкцыя працы даручыла ёй работу ў біржавой камісіі, там яе хутка абралі сэкратаром. Яна правяла ў Менску абсьледваньне грамадзкіх работ. **4 разы ў розных мясцох Райхэльсон выявіла**

На концы з мандатам.

выпадкі протэкцыянізму. Па яе даносу біржа зьняла з працы шмат якіх рабочых і дзясятнікаў. Дзесятнікі давалі жанчынам непасільную работу, калі мелася работа, падыходзячая да жанчын, дзесятнікі і табельшчыкі «хавалі рабочыя дні», проста не вялі вучоту рабочых дзён,—Райхэльсон гэта прыкмеціла і «зладзеяў»—хутка зьнялі з работы.

Да даручанай работы **Райхэльсон** заўсёды адносіцца старанна і ўважліва.

* * *

Ёсьць яшчэ 3-4 комсамольцы, якія накрыху, але працуюць у сваіх сэкцыях. Большасьць абраных жадала-б працаваць, але ўмовы не даюць гэтай магчымасьці.

А. Рыдлеўскі.

Зоркае вока.

(Мястэчка Бярэзіна-Паўднёвае, Меншчына).

Нядаўна на сходзе ячэйкі мы заслухалі інформацыю старшыні мясцовага савет аб працы ў савеце нашых комсамольцаў.

— Комсамольцы актыўна ўдзельнічаюць ва ўсёй рабоце местачковага савету. **Яны правялі вучот аб'ектаў абкладаньня па сельска-гаспадарчаму падатку, яны дапамаглі ў працы пры надзяленьні зямлёй насельніцтва, ліквідавалі нядоімкі па падатках, знайшлі гандляроў, якія ня мелі патэнту на гандаль.**

Сход ячэйкі і мясцовы савет адабрылі работу комсамольцаў-сяброў местачковага савету. У далейшым ім даручылі ўзыскаць сяброўскія ўзносы па сялянскаму камітэту ўзаемадапамогі дапамагчы ў працы тэхнічнаму сэкратару. Да 10-ай гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі яны выпусьцяць насьценную газэту пры местачковым саведе.

В. А. Каўцевіч.

НАБЫВАЕМ ВАЙСКОВЫЯ ВЕДЫ.

Пазнаёміліся з армейскімі законамі.

(Ляхаўскі раён)

Нядаўна скончыла сваю працу група комсамольцаў-прызыўнікоў пры Ляхаўскім райкоме. На 4-х занятках групы прапрацаваны пытаньні міжнароднага становішча і задач Чырвонай арміі. Таксама растлумачаны асноўны закон аб вайсковай службе, організацыйная структура парторганізацыі і роля комсамолу ў Чырвонай арміі.

Гутаркі на занятках праводзіліся партыйцамі з падшэфнага эскадрону. Актыўнасьць была досыць добрая. Асабліва яна адчувалася тады, калі група разглядала пытаньне аб парторганізацыі ў арміі. Зараз ужо комсамольцы добра ведаюць, чым адрозьніваецца вайсковая партыйная організацыя ад грамадзянскай. А гэта вельмі важна для таго, каб комсамолец па прыходзе ў армію адразу-ж выхаваў у сабе дух баявой дысцыпліны чырвонаармейца.

Зараз ячэйкі Ляхаўскага раёну налажваюць вечары провадаў прызыўнікоў.

У Чырвоную армію сёлета ідзе з Ляхаўскай організацыі каля 60 комсамольцаў.

Газ.

Страляем без промаху.

(Віцебск, ячэйка ЛКСМБ Працасьветы).

Кожнае новае пачынаньне ў ячэйцы спачатку прымаецца з захапленьнем і запалам, але прывіцца яму даволі цяжка. Так было і з вайсковай работай. У вайсковы гурток запісалася бадай уся ячэйка, у ТСААвіяхіму таксама ўсе сябры ўступілі. Але, калі дайшла справа да наведваньня заняткаў гуртка, плаціць сяброўскія ўзносы пал прапаў.

Вайсковая праца пачала кульгаць.

На дапамогу прышоў стралковы цір. На мізэрныя грошы з сяброўскіх узносаў бюро ячэйкі стварыла гэты цір.

Стральба хутка зацікавіла комсамольцаў. Штодзённа ў ціры можна бачыць шмат комсамольцаў, якія вучацца метка страляць. Спачатку было вельмі цяжка—комсамольцы, нават, трымаць вінтоўку ў руках ня ўмелі. Потым па крыху прыстасаваліся.

Штодзённа цяпер ад сатаварысцкай вайсковай часткі ў ціры дзяжураць комсамольцы-чырвонаармейцы. Яны чым могуць, тым дапамагаюць комсамольцам ячэйкі.

Калі комсамольцы сталі наведваць цір, яны і ўбачылі сваю памылку.

Страляць бадай ніхто ня ўмеў. Адразу-ж зацікавіліся працай гуртка. Цяпер і гурток і цір працуе. Маем шмат дасягненьняў. Шмат якія комсамольцы страляюць без адзінага промаху.

На зіму організоўваем праваліўшыся вясною гурток санітарных ведаў.

А—кі.

...А райсавет сьпіць.

(Вёска Машніца, Койданаўскі раён, Меншчына).

Некалькі тыдняў таму назад тут моладзь організавалася ў ячэйку ТСА Авіяхіму. Пры організацыі запісалася 13 чалавек, а зараз пасьля кожнага чарговага сходу уступаюць новыя і новыя таварышы. Сёньня сход ячэйкі, па ліку 3-ці пасьля організацыі.

І толькі перастала сыпацца ў паграбы прывезеная з поля сьвежая бульба і праз вокны хат праменьні ад лямпаў выпаўзьлі на двор, моладзь сабралася на сход.

На абвесцы дню даклад аб тым, як і што павінна рабіць ячэйка ТСА Авіяхіму.

Пакуль заслухоўваць даклад хлопцы вядуць гутаркі паміж сабою:

— Што нам значыць унесьці за год узносы, заўтра ўсе будуць сабраны,—кажа бялявы хлапец свайму суседу.

— Толькі шэсьць білетаў 2-й авіяхімлётарэі нам прыслалі.

— Кажа мне сэкратар ячэйкі.

— Нам хаця-б якіх 20, а то гэтыя шэсьць ужо і расхапілі, нават да агульнага сходу ня змог пратрымаць.

— ... Трэба будзе ў будучым наладзіць практычныя стрэльбішчы, ваенныя паходы, гульні і г. д.

— Кажа дакладчык аб будучай працы ячэйкі.

—Зацікаўленасьць у вывучэньні вайсковай справы ў моладзі нявыказна вялікая.

Дрэнна, што райсавет ТСА Авіяхіму не дае кіраўніцтва.

С. Марка.



Міжнародны агляд.

Толькі сваімі сіламі

Узяць уладу ў капіталістых і будаваць социялізм—вось да чаго імкнуцца рэволюцыйныя профсаюзы Францыі.—Мы стаім за дыктатуру пролетарыяту і ідзем разам з комуністычнай партыяй—так заявіў зьезд барацьбітоў за рэволюцыю.—Чырвоны сьцяг зьяўляецца адзіным сьцягам паўстаўшага сялянства Кітаю.—Зямля павінна перайсьці ў рукі беднякоў.

На баявым пасту.

26 верасьня ў горадзе Бордо (Францыя) зачыніўся зьезд францускіх рэволюцыйных профсаюзаў.

У 1921 годзе меншавіцкія правадыры францускіх профсаюзаў выключылі з шэрагаў профсаюзаў рэволюцыйную частку.

Па колькасьці сяброў рэформісцкія саюзы і рэволюцыйныя—амаль роўныя.

Рэформісцкія профсаюзы Францыі ўсе свае надзеі ўскладаюць на перамовы і згоды з гаспадарамі і з буржуазнымі партыямі ў парляманце.

Рэволюцыйныя-ж профсаюзы прытрымліваюцца зусім іншай тактыкі.

Яны ўпэўнены, што вызваленьне рабочай клясы можа адбыцца толькі сваімі ўласнымі сіламі.

Рэволюцыйныя рабочыя ня вераць

Сацыяльнае паходжаньне цьвердалобых.

І ў той і ў другой частцы па 500 тысяч сяброў. Але па сваіму складу яны зусім розныя.

У рэволюцыйную частку профсаюзаў уваходзяць, галоўным чынам, прамысловыя рабочыя і чыгуначнікі. Рэформісцкія профсаюзы складаюць дзяржаўныя і гандлёвыя служачыя, настаўніцкія саюзы і некаторым уплывам рэформісты карыстаюцца сярод вугляконаў.

буржуазіі і яе парляманту, не ўскладаюць надзей і на Лігу Нацый, а, наадварот, яны заклікаюць увесь пролетарыят выступіць супроць буржуазіі і яе ўстаноў.

Узяць уладу ў капіталістых і будаваць социялізм па прыкладу Савецкага Саюзу—вось да чаго імкнуцца рэволюцыйныя профсаюзы Францыі.

На сваім зьезьдзе большасьць, рэволюцыйных профсаюзаў выказалася за правядзеньне адзінства ў рабочым руху.

— Нашы дзьверы адчынены для кожнага рабочага, які жадае ісьці па шляху клясавае барацьбы,—заявіў зьезд у прынятай рэзолюцыі.

— **Мы стаім за дыктатуру пролетарыяту і ідзем разам з комуністычнай партыяй,** але мы разьлічваем ня толькі на адных комуністых.

Кожны беспартыйны рабочы зьяўляецца нашым пажаданым сябрам, калі ў ім будзе гарэць агонь пролетарскай самасьвядомасьці.

Вось, як заяўляюць рэволюцыйныя рабочыя капіталістычнай Францыі.

Каб прывабіць больш сяброў ў свае шэрагі, зьезд рэволюцыйных профсаюзаў ухваліў перабудаваць саюзы не па цэхаваму прынцыпу (сьлесары асобна, маляры асобна і г. д.), а па вытворчаму.

Гэта азначае, што ўсе рабочыя на адным прадпрыемстве—да якога цэху яны не належылі, павінны ўваходзіць у адзін саюз, гледзячы па тым, да якой вытворчасьці адносіцца завод.

Пры такой сыстэме рабочым лепш весьці барацьбу супроць капіталістых.

Апрача таго, зьезд ухваліў ува ўсіх саюзах утварыць касы ўзаемадапамогі. Касы гэтыя павінны даваць неабходную дапамогу сваім сябрам пры хваробах, беспрацоўі і забастоўках.

У Францыі да гэтага часу няма соцыяльнай забясьпекі і натуральна гэта пастанова будзе прыцягваць у рэволюцыйныя профсаюзы большы лік сяброў.

Зьезд адбываўся пры вялікім рэволюцыйным уздыме яго ўдзельнікаў.

Першая вялікая перамога.

Кітайская рэволюцыйная армія, пад камандай комуністага Іе-Піна, узяла буйны партавы горад у Паўднёвым Кітаі—Сватоу.

Пасьля контр-рэволюцыйнага пераваротy ў Ухане, імпэрыялісты і згоднікі ўсіх краёў прадракалі поўнае «успакаеньне» ў Кітаі.

Але падзеі паказалі зусім адваротнае.

Ніякія контр-рэволюцыйныя пераваpоты ня могуць спыніць барацьбу сялянства за зямлю, супроць вялізарнай арэнднай платы, супроць падаткаў, супроць буржуазіі і яе генэралаў.

Наадварот, здрады ў Уханска-Нанкінскім лягеры выклікалі новы ўздым сялянскай барацьбы.

Іменна гэтыя здрады і перавароты паказалі, што толькі ў хаўрусе з рабочай клясай, толькі сваімі рукамі, сілай, узброенай барацьбой, рэволюцыяй, сялянства можа дасягнуць здавальненьня сваіх запатрабаваньняў, дасягнуць паляпшэньня свайго матар'яльнага становішча.

Дзякуючы падзеям апошніх гадоў, кітайскае сялянства адносна добра організавана.

Сялянскія саюзы налічваюць зараз 11 мільёнаў сяброў.

Яны ў той-жа час зьяўляюцца масавымі ваеннымі організацыямі. З збраей у руках яны вядуць зараз барацьбу супроць земляўласьнікаў і контр-рэволюцыйнай буржуазіі.

Чырвоны рэволюцыйны сьцяг зьяўляецца адзіным сьцягам паўстаўшага сялянства Кітаю.

На дапамогу паўстаўшаму сялянству ідуць рабочыя атрады, якія павінны адыграць рашучую ролю ў кітайскай рэволюцыі.

Хваля забастовак коціцца па ўсяму Кітаю. Бастуюць рабочыя на прадпрыемствах у Шанхаі, Ханькоу і Кантоне.

Якое значэньне мае узяцьце Сватоу?

З узяцьцем Сватоу рэволюцыйны саюз рабочай клясы з сялянствам мае вялізную апору.

Сватоу зьявіцца вялікім часовым цэнтрам барацьбы рабочых і сялян супроць буржуазіі.

Зараз перад рэволюцыйнай арміяй адчыняецца шлях на Кантон.

Узяцьце Сватоу—толькі першы вялікі крок уперад. Контр-рэволюцыйныя арміі маюць колькасную перавагу. Яны у параўнаньні з рэволюцыйнымі войскамі лепш узброены. Іх адчынена падтрымліваюць замежныя імпэрыялісты.

«Праз чырвоны тэрор зьнішчым белы тэрор»

Цікава спыніцца на тым, што кажуць правадыры паўстаўшых рабочых і сялян.

У іх адозьве да народу гаворыцца:

«Рэволюцыйны камітэт у Нанчане ўзьняў паўстаньне за справу справядлівасьці і будзе весьці далей сапраўдную барацьбу супроць Нанкіну і Ухану».

Камітэт загадаў расклеіць у горадзе Сватоу рэволюцыйныя плякаты і лёзунгі.

Сярод лёзунгаў ёсьць наступныя:

«Барацьба супроць комуністых—ёсьць контр-рэволюцыя». «Зямля буйных магнатаў падлягае конфіскацыі і раздачы бедным сялянам». „Праз чырвоны тэрор зьнішчым белы тэрор». На ўсе адміністрацыйныя пасады гораду прызначаны комуністыя.

Зараз няма ніякага сумленьня, што рэволюцыйныя сілы Кітаю, на чале якіх стаіць комуністычная партыя, адкінуць ад сябе здраднікаў і будуць шпаркімі крокамі рухацца ўперад.

Перамога рэволюцыйных войск пад Сватоу ў гэткіх цяжкіх умовах—зьяўляецца вялізным дасягненьнем працоўных.

Гэта перамога паказвае, наколькі моцна рэволюцыя мільёнаў працоўных Кітаю, яна паказвае, што іх канчатковая перамога не за гарамі.

Працоўныя масы Савецкага Саюзу будуць уважліва сачыць за барацьбой рабочых і сялян Кітаю супроць сваёй і замежнай буржуазіі, за іх посьпехамі і няўдачамі.

Алёнін.

СПРАВЫ і ДНІ АДНАГО ПРАДПРЫЕМСТВА
АГЛЯД АБУТКАВАЙ ФАБРЫКІ

Сёньня—трэці дзень нашага агляду.

Абгаварваем пытаньне—„Удзел моладзі ў вытворчасьці“

Заклікаем усіх рабочых і работніц выказвацца.

Мова лічбаў.
(Дасягненьні фабрыкі).

Дасягненьні нашай фабрыкі відаць з наступных лічбаў.

Экономія кройкі сыравіны, зьмяншэньне нормы форнітуры і рэарганізацыя вытворчасьці, далі зьмяншэньне сабекошту продукцыі.

Мужчынскі хром з 1924 па 1927 г. стаў таньней на 26,6 проц.; поўгэтры хромавыя на 31, 3 проц.

Штодзённая выпрацоўка рабочага павялічылася на 114 процантаў.

Сярэдні заробак рабочага павялічыўся на 40 процантаў.

Загружанасьць вытворчасьці поўфабрыкатамі паменшылася за гэты-ж тэрмін на 46 процантаў.

Рабочы **Шнэйдэр.**

ЗАМЕСТ АДНЭЙ МАШЫНЫ ТРЫ.
Маем значныя паляпшэньні. Неабходна зьнішчыць маючыяся недахопы.
(У штамповачным аддзяленьні)

У 1924 годзе, калі адчынілася наша фабрыка, яна ня мела выгляду фабрыкі, а была падобна на саматужную майстэрню.

Штамповачнае аддзяленьне, якое падрыхтоўвае ўсю ніжнюю частку да абутку (раскрой цьвёрдай скуры, падэшвы, сьцелькі, заднікі, абсацы, набойкі і наскі) ня было амаль зусім абсталявана. Якасьць працы была дрэнная.

Мала было і мадэляў па якіх вырэзваецца матар'ял. Работала ўсяго адна машына для выразкі патрэбных рэчаў, так званая „планэта“.

Цяжка было работаць.

Зусім ня тое ў нас цяпер. Замест ранейшай аднэй «планэты»-машыны, маюцца тры штампа-варштаты для вырубкі падэшваў, сьцелак і заднікаў.

Мадэляў у сучасны момант маецца ў дастатковай колькасьці як драўляных, так і мэталічных.

Скуры крояцца па шоры, на якіх адразу пішуцца нумары адпаведна асортыманту мадэляў.

Калі наша аддзяленьне ня было абсталявана, мы адставалі і ў якасьці і ў колькасьці ад другіх аддзяленьняў.

Цяпер мы не адстаём ні ў якасьці, ні ў колькасьці. Мы маем цяпер магчымасьць і значна экономіць у кройцы.

Але нельга здавальняцца гэтымі дасягненьнямі. Побач з імі маюцца ў нас і недахопы.

Трэба направіць мадэлі нашага аддзяленьня, бо па іх часта выходзяць падэшвы альбо вузкія, альбо шырокія.

Майстру аддзяленьня трэба больш глядзець за тым, каб падбор шор для выдачы рабочым абавязкова быў па нумарох асортымэнтаў.

Неабходна таксама сачыць за тым, каб шоры моклі і прапускаліся праз прэс-машыны. Цяпер часта шоры бываюць няроўныя і пры разацы цяжка экономіць матар'ял.

І апошні ў нас недахоп гэта тое, што нашыя варштаты ў нясправунасьці. У часы работы вельмі часта вывінчваюцца розныя вінты і г. д., што і перашкаджае рабочаму ў вытворчасьці працы.

Толькі зьнішчыўшы гэтыя недахопы, змажам мы хутчэй прасунуць наперад нашу фабрыку.

Уладзіслаў Гурэцкі.

Папсаваную машыну не рамантуюць.
(У штамповачным аддзяленьні).

На фабрыцы ёсьць шмат дасягненьняў. Гэта—факт.

Напрыклад, усяго толькі гадоў паўтара назад выраблялася ў нас клейка дамскіх абсацаў ручным спосабам. 100 пар абсацаў аплачваліся 12 рублямі.

У сучасны момант за 100 пар плацяць 4 рублі 33 капейкі.

Але побач з дасягненьнямі ёсьць і недахопы.

Нясправунасьць варштатаў - штампаў выклікае затрымліваньне ў працы амаль кожны дзень 15—20 хвілін.

Таксама нясправуны і формы (штанцы) на якіх рубяць.

Працавала ў нас машына для прыбіўкі кранцаў. Цяпер яна папсавалася.

Неабходна яшчэ адзначыць тое, што адсутнічае кацёл для мочкі скуры.

Зьнішчэньне гэтых недахопаў дасьць магчымасьць выканаць новую вытворчую праграму ў 400 пар у дзень.

Рабочы штамповачнага аддзяленьня
М. Іткін.

2 гады не вастрылі штампаў!
Вымовы выносяцца няправільна.
(У штамповачным аддзяленьні)

Многа трэба гаварыць аб недахопах у штамповачным аддзяленьні. Я хачу застанавіцца толькі на некаторых.

Калі перанесьлі штамповачнае аддзяленьне ўніз, маю **машыну паставілі няправільна.**

Раней казалі, што гэта на пару дзён. Цяпер прайшло ўжо некалькі месяцаў, а ніхто і ня думае машыну перастравіць. А стаіць яна ў вельмі цесным месцы і работаць дрэнна.

Штампы таксама дрэнна работаюць. Два гады іх ужо ня вострацЬ.

Некаторыя **трэба** было зусім заманіць **новымі.**

Рабочыя трацяць шмат часу на пераноску абрэзаў, што перашкаджае рабоце.

Некаторыя **машыны дрэнна работаюць.** Увесь час гавораць, што іх трэба адрамантаваць. Але толькі гавораць!

*

Некалькі слоў аб **вымовах.** Яны часта ў нас **бываюць няправільныя.** Быў выпадак, калі адміністрацыя дала рабочаму вымову, а майстар аддзяленьня нават ня ведаў за вошта гэта.

Рабочы **Л. Каплан.**

Патрэбен абутак з нізкімі абсацамі
Мала ўдзельнічаем у вытворчай нарадзе
Бронь Юдалевіч сыстэматычна скарыстоўваецца на падсобнай рабоце.

У нас на фабрыцы маюцца значныя дасягненьні. Аб іх ужо пісалі. Я хачу сказаць нешта аб недахопах.

Зусім нерэгулярна склікаецца ў нас вытворчая нарада. Моладзь у ёй зусім мала ўдзельнічае.

Дрэнна праводзіцца дырэктыва аб кваліфікацыі жанчын.

Напр.: **т. Краўчанка** 3 гады работае прыбіральшчыцай. Работніца **Пэрэльман** увесь час работае на нізкакваліфікаванай рабоце. **Бронь-Юдэлевіч сыстэматычна скарыстоўваецца на падсобнай рабоце.**

Наша фабрыка не прыстасоўваецца да мясцовага рынка. Абутак робіцца ня прыгожы — з надта высокімі абсацамі

Неабходна было-б частку абутку рыхтаваць з нізкімі абсацамі.

Калі зрабілі невялікую колькасьць лодачак з нізкімі абсацамі, іх адразу расхапілі.

Цяпер іх чамусьці больш не вырабляюць.

Работніца **Русановіч.**

Прыкмячаюць дрэнную якасьць.
Трэба больш увагі да моладзі з боку майстраў

Моладзь цікавіцца ў паляпшэньні і наладжваньні вытворчасьці. На вытворчай нарадзе яна ўносіць карысныя прапановы, якія прымаюцца і праводзяцца ў жыцьцё.

Я лічу дадатным бокам у моладзі тое, што яна ўсюды прыкмячае дрэнную якасьць і паведамляе аб гэтым вытворчую камісію.

Часта недахопы адразу-ж на месцы спраўляюцца.

Што датычыцца якасьці работы моладзі, дык я лічу, што тут патрабуецца больш увагі да яе з боку майстроў.

Старшыня вытворчай нарады
Кугель.

У загатовачным аддзяленьні.

На падсобнай рабоце.
Юдэлевіч тры тыдні шнуруе абуткі.
(У загатоўчым аддзяленьні).

Пабачым, што робіцца ў загатоўчым аддзяленьні. Там лепей чым было. Раней, ўсе прымацаваныя туды 3 «бранявіка», скарыстоўваліся на падсобнай рабоце.

Але ня зусім добра і цяпер. Напрыклад, у «бранявіка» **Зальцман** трэба было зрабіць невялічкую пачынку машыны, на якой яна працавала.

Дык вось гэтую пачынку зрабілі толькі праз доўгі час. А **Зальцман** пакуль што не змагла работаць.

Таксама і з «бранявіком» **Юдэл[illegible]** з-за невялічкай пачынкі, якая патрабуецца ў брусовачнай машыны і аб якой ніхто не клапоціцца, «бранявік» псуе работу.

Потым прыносяць спорчаную работу і ніхто нават ня цікавіцца чаму яна сапсавалася.

Калі гаворыш, што машына сапсавалася, то адказваюць, што трэба пачакаць, а пакуль саджаюць на падсобнай рабоце шнураваць абуткі «на дзень».

І цягнецца гэты дзень для «бранявіка» 3 тыдні. Час пакуль ідзе і «бранявік» ня кваліфікуецца.

ЮДЭЛЕВІЧ.

Машына, якую не рамантуюць.

Удзельнічаем у вытворчай нарадзе.
Ці гэта сапраўды, ці толькі словы?

Кожны комсамолец нашай фабрыкі ў працы вытворчай нарады ўдзельнічае добраахвотна. Але ёсьць адзін спэцыяльна вылучаны—сябра вытворчай камісіі, які пад кіраўніцтвам экономкамісіі акругкому ЛКСМБ павінен прымаць удзел у вытворчых нарадах. Гэты хлапец працуе вельмі добра і актыўна. Дзякуючы яму, шмат якія другія комсамольцы прыцягнуты да працы вытворчай нарады.

Кожны дзень, калі павінна адбыцца нарада, гэты комсамолец абыходзіць усе аддзяленьні і апавяшчае абвестку дню, гутарыць з комсамольцамі на вытворчыя тэмы і ў выніку нашы комсамольцы наведваюць нарады на 40 проц.

Раней хлапцы нарадай зусім ня цікавіліся. Калі наш прадстаўнік дабіўся там, каб ставілі цікавую абвестку дню, уключалі моманты аб працы моладзі, тады хлапцы зацікавіліся.

Зроблена намі многа.

На вытворчай нарадзе, напрыклад, паднялі пытаньне аб тым, што ў загатовачным аддзяленьні зломана машына. Машыну ня толькі направілі, але паставілі і новую.

Ці раней у нас было так, што майстры бралі сабе самыя лёгкія работы, а вучням давалі цяжкія. Ад гэтага было многа браку. Мы паставілі аб гэтым пытаньне на вытворчай нарадзе і ў выніку недахоп зьнішчылі.

У цьвіковачным аддзяленьні адзін майстар-спэц тармазіў усю працу. Дзякуючы таму, што мы паднялі аб гэтым пытаньне, майстра зьнялі з працы.

Адносіны нашай моладзі да вытворчасьці вельмі добрыя. Моладзь акуратна зьяўляецца на працу, перапынкаў аніякіх у працы няма. Хлапцы працуюць ня горш за дарослых. Калі хто-небудзь зрабіў брак, нашыя хлапцы заўсёды аб гэтым паведамляюць адміністрацыю.

Сумеснымі сіламі мы дабіліся добрых вынікаў.

Баскін.
(Аддзелачнае аддзяленьне).

ГУРЭЦКІ адзін з старэйшых рабочых фабрыкі.

Дайце меншыя кольцы!
(У загатоўчым аддзяленьні).

Я работаю на мэханічнай машыне для ўстаўленьня калец.

Кольцы, якія мне даюць для загатовак, вельмі вялікія. Яны не праходзяць па лінейцы машыны. Гэта замядляе работу.

Трэба купляць меншыя кольцы, тады будзе большая вытворчасьць працы.

Работніца **Шуслан.**

Рабочыя мала навучаюць вучняў.
Узаемаадносіны моладзі з дарослымі рабочымі здавальняючыя

Калі да нас прыбылі машыны, ня было старых кваліфікаваных рабочых, якія змаглі-б на іх работаць. Хацелі прывучыць да іх вучняў, але ніхто з іх, апрача двух, не згадзіўся на гэта. Яны лічылі, што фабрычны рабочы—гэта не рабочы.

Прышлося набраць іншых і навучыць работаць на машыне, а моладзь засталася на фабрыцы ў вандруючым становішчы. Прапрацуе 2 дні на аднэй рабоце і адмовіцца.

У выніку, значная частка моладзі скарыстоўвалася на ніскакваліфікаванай рабоце.

Тая-ж частка, якая прывучылася да машын, амаль не адстае цяпер у вытворчасьці працы і заробку ад дарослых рабочых.

Некаторыя з моладзі зарабляюць па 90—100 рублёў у месяц.

Як-жа наша моладзь удзельнічае ў вытворчай нарадзе?

Трэба сказаць што слаба. Зусім малы процант з яе наведвае нараду. Амаль зусім ня выказваюцца.

Не адчуваецца таксама, што моладзь цікавіцца вытворчасьцю. Я лічу тут віноўнымі ўмовы нашай фабрыкі, якія не даюць магчымасьці пасоўваць моладзь на больш кваліфікаваную работу.

Некалькі слоў аб нашай „броні“. „Бранявікі“ ў працы зацікаўлены. Але рабочыя, да якіх прымацавана бронь не вылучаюць належнай увагі абучэньню вучня.

Хоць рабочы і атрымоўвае за абучэньне вучня, але ён пры паштучнай аплаце гоніцца за ўсё большай выпрацоўкай. У выніку—абучэньне броні ідзе павольна. Але ўсё-ж вучні маюць за апошні год добрыя пасьпехі.

Узаемаадносіны моладзі нашай фабрыкі з дарослымі рабочымі здавальняючыя. Былі некаторыя непаразуменьні ў нацяжным аддзяленьні. Але гэта ў нас рэдкія выпадкі.

Дрэннае становішча моладзі, якое было паўтара гады назад, адышло ўжо ў мінулае; чым далей, тым ўсё больш паляпшаецца ў нас становішча моладзі.

Памочнік майстра загатовач. аддзяленьня **Клеонскі.**

Вучань БАБРОУСКІ, які хутчэй за іншых паляпшае сваю кваліфікацыю.

Ніводнага прагульшчыка.

П'янства—галоўны вынік прагулаў. Быў час, калі п'янства сярод комсамольцаў маладых рабочых абуткавай фабрыкі лічылася звычайным зьявішчам. Комсамольцы штодзённа „дэрбалызалі“, а назаўтра... ня прыходзілі на работу, альбо зьяўляліся п'янымі, чым таксама ня прыносілі ніякай карысьці вытворчасьці, а наадварот.

Шляхам высьвятленьня гэтага пытаньня ў фабрычнай насьценгазэце і прыняцьця суровых мер да п'яніц, ячэйка павяла рашучую барацьбу з гэтым злом.

Зараз сярод комсамольцаў абутковай фабрыкі няма ніводнага чалавека, зрабіўшага прагула па няўважным прычынам.

ФАБРЫЧНЫ.

КАЛІ ПІОНЭРЫ З АХВОТАЙ ІДУЦЬ У АТРАД?..

Ніводзін піонэрскі атрад не павінен прайсьці міма агляду.

КОЖНАЕ ЦІКАВАЕ ДАСЯГНЕНЬНЕ Ў ПРАЦЫ АТРАДУ, ЗЬВЯНА—ДАСЫЛАЙЦЕ Ў ГАЗЭТУ.

РЭДАКЦЫЯ „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ“ ЧАКАЕ ДОПІСАЎ.

Раніцою, з граблямі па сенажаці.

(Петрыкаў, Мазыршчына)

Атрад імя Чарвякова за апошнія 6 месяцаў правёў шмат практычнай грамадзкай працы. У кампаніі дапамогі братом Заходняй Беларусі мы паставілі спэктакль у карысьць МОПР-у, сабралі грошы сярод піонэраў і школьнікаў. У Міжнародны Дзіцячы Тыдзень атрад паставіў спэктакль, які даў больш 20 рублёў у карысьць дзяцей Кітаю.

У вёсцы Балапавічы мы сыстэматычна праводзім сход дзяцей, гульні, сьпевы. Згаварыўшыся з сельсаветам, мы дапамаглі бяднейшым сялянам на сенажаці. У 6 гадзін раніцою піонэры прышлі з граблямі, вілкамі і ў дзень зграблі каля тысячы пудоў сена. Мы ўзялі шэфства над дзіцячай пляцоўкай у вёсцы Бялкі. Мы хадзілі туды два разы ў тыдзень, праводзілі з дзяцьмі экскурсіі, гульні, сьпевы.

У тыдзень абароны наш атрад сабраў у карысьць ТСА-Авіяхіму 1 руб. 32 кап.

Саламон Залескі.

Маленькіх пастушкоў у піонэры.

(Лядзянскі раён).

Пасьля амаль паўгадовай працы піонэрорганізацыі па мэтаду грамадзкакарысных заданьняў можна ўжо падвесьці вынікі.

Першыя распрацаваныя заданьні («дапаможам дзецям-батракам», «дапаможам дзецям ангельскіх гарнякоў») былі скомканы, але-ж усё-ткі некаторыя вынікі далі: атрады выявілі малагадовых батрачат. Паладзілі з імі сувязь. Некаторыя батракі ўступілі ў атрад. Сабраўшы 7 рублёў, мы адаслалі іх дзецям ангельскіх гарнякоў.

Пры праверцы дырэктыў, кідаецца ў вочы тое, што самы павадыры не зразумелі новы зьмест працы як трэба: заданьні распрацоўваліся ў працягу толькі двух тыдняў, зьвеньням даваліся заданьні зусім іншыя, няўвязаныя з заданьнямі атраду.

Цяпер гэтыя недахопы зьнішчаны.

Атрады навучыліся скарыстоўваць досуг, прыцягнулі на службу балалайку, гармонь (Бельскі атрад), на зборы ўводзяць шашкі, рэбусы, гульні і сьпевы. У мястэчку склікаюцца нарады піонэраў па цікавячых іх пытаньнях (нарада рэдкалегіі, юнатаў і г. д.).

Паўлюк Цішуроў.

Піонэрская „Сіняя Блюза“.

(Гор. Рэчыца).

Наш гарадзкі піонэрскі клюб абслугоўвае 11 піонэрскіх атрадаў і 4 групы акцябрат. Пры клюбе маецца чытальня, бібліятэка і шашачны пакой. Сіламі саміх піонэраў утвораны гурткі: «Сіняя Блюза», дзяткораўскі, музычны, радыё-гурток і гурток канькабежцаў. Цяпер наладжваем пераплётную майстэрню і гурток кройкі і шыцьця. Асабліва дзеці цікавяцца мастацкімі гурткамі, «Сіняй Блюзай», музычным. Сіламі гэтых гурткоў мы абслугоўваем свае піонэрскія вечары, сходы бацькоў і профсаюзныя сходы.

Гурток «Сіняй Блюзы» некалькі разоў выяжджаў у вёску, там выступаў перад вясковымі дзяцьмі.

Кожны дзень вечарам у клюбе адчуваецца жывасьць. З аднаго пакою чутны гукі вясёлага маршу, у другім пакоі піонэры, нахіліўшыся над кнігай, чытаюць, у трэцім—працуе гурток, бібліятэка. Весела, спакойна і цёпла. Агульнымі сіламі, дружнай колектыўнай працай мы будуем нашае новае жыцьцё.

Я. Кауфман.

Самі гаспадары.

(Антонава, Капыльскі раён, дзеткалёнія),

Дзеці бедных сялян, сіраты, бяспрытульныя,—вось каго прымае дзеткалёнія ў Антонаве. 45 дзяцей, якія знаходзяцца ў калёніі, зьяўляюцца піонэрамі.

Атрад падзелены на 4 зьвеньні.

Асабліва актыўна ўдзельнічаюць дзеці ў гаспадарчым жыцьці сваёй калёніі.

З наступленьнем вясны піонэры сваімі рукамі баранавалі, капалі градкі, саджалі розныя расьліны. У выніку—агарод, які ў мінулым годзе нікуды ня быў годны, сёлета заквітнеў. Піонэры таксама ўзьнялі пытаньне аб рамантаваньні дарогі, якая вядзе да калёніі.

І раніцою, выстраіўшыся ў шэрагі з рыдлёўкамі і насілкамі, накіраваліся на работу.

За тыдзень паладзілі дарогу. Акрамя гэтага, ачысьцілі 5 дзесяцін лесу.

Цікавяцца нашы дзеці і фізкультурай. Мы абсталявалі фізкультурную пляцоўку, самі зрабілі розныя спартыўныя прылады. Калёнія мае гаспадарчы, малочны, санітарны гурткі. Дзяткораўскі гурток выпушчае насьценгазэту. **Малевіч.**

Шавелім мазгамі

(Барысаў)

Барысаў--невялічкі горад, а фабрык і заводаў многа. Многа тут і дзяцей рабочых, організаваных у «піонэры». У цэнтральным піонэрскім клюбе сгуртавана работа большасьці барысаўскіх атрадаў. Тут і майстэрні і розныя гурткі. Каля 30 маленькіх модэлістых усю зіму працавалі пад кіраўніцтвам сьвядомага майстра, а ўлетку ўжо самастойна рабілі рысункі і розныя схэмы. Піонэратрад добра дапамагаў маленькім модэлістым.

Што робіцца ў горадзе?

Такое пытаньне паставіў перад сабою атрад саўгандслужачых, і парашыў азнаёміцца з працай больш буйнейшых устаноў гораду.

Вось вам зададуць пытаньне: у селяніна ўкралі каня. Як пачаць шукаць яго? Ня ведаеце, а піонэры Барысаўскага атраду ведаюць, бо яны чулі гутарку ад агэнтаў Крымінальнага Вышуку і іншых важных устаноў.

Сваімі рукамі.

У марозны дзень піонэры хадзілі катацца на санках з вялікай гары. Дзе яны бралі санкі? А сваімі рукамі зрабілі. Зрабілі яны ў сталярнай майстэрні і рамы для вакон піонэрскага пакою, і яшчэ іншыя рэчы.

У летні дзень можаце бачыць прыгожы малюнак. У садзе пад дрэвамі сядзіць група піонэрак і вышывае. Імі кіруе старшая піонэрка, якая добра ведае гэтую справу. Гэтая праца вельмі цікавіць дзяўчат.

Піонэры супроць бога.

Работа па барацьбе з клерыкалізмам яшчэ не разгорнута. Піонэры яшчэ нічога не зрабілі, каб дзеці не хадзілі ў хэдэр. Але ўсё-ж Барысаўская організацыя даказала, што ніводзін піонэр (а ў Барысаве іх вельмі многа) у дзень Пасхі не спраўляў сэйдэр (трапэзу). Калі адзін кіраўнік справамі ў савецкай школе аказаўся былым мэламэдам і летам стараўся ўцягнуць дзяцей у хэдэр, дзеці далі яму адпор і цяпер яго зьнялі з працы.

Піонэры на варце.

Работа па ваенізацыі ахапіла амаль усе атрады. Аднойчы ў 5 гадзін раніцы наладзілі піонэрскую трывогу. Яшчэ горад спаў, калі пачуліся сьвісткі дзяжурных піонэраў. У 5 хвілін уся барысаўская піонэрорганізацыя была на нагах.

У атрадах працуюць стралковыя гурткі, яны зацікавілі дзяўчат. Маюцца зусім маленькія піонэркі, якія даволі добра страляюць.

У піонэрскім доме.

У ім ёсьць 4 майстэрні: шавецкая, кравецкая, сталярная і пераплётная. Лепш за ўсё працуюць маладыя сталяры і краўцы. Большасьць дзяўчат добра шыюць, а бывае прымаюць і заказы.

Уся драўляная мэбля (сталы, шкапы, ложак)—зроблена тут рукамі саміх дзяцей.

У піонэрскім доме ёсьць галубятні. А побач з галубятняй—група прыхільнікаў-галубятнікаў. Яны адбіраюць лепшыя пароды «чырвонахвостых» і сочаць, даглядаюць за імі, і ведаюць кожную дробязь «галубінага жыцьця». Вось ляцяць галубы. «Галубятнік» ужо ведае, што «чырвонахвосты» зробіць апошняе кола, паляціць вакол дому і сядзе на каменьні.

Дзеці лічаць, што заняткі з галубамі—рэч надта карысная, калі яна ня прымае хуліганскі ўхіл.

Н. Л—н.

Андрэй Александровіч.

Паўстанцы.

Поэма *)

Дзея адбываецца ў маладым густым сасоньніку. Ноч. Цёмна. Чуецца бадзёры голас:

Б'юць званы новых дзён,
гэй, бедната, слухай!

Надыходзе час помсты,
паўстаць надыходзе час.
Помсту шрапнэляю гострай
кідай паном з пляча.

Ня плач сьлязою цноты,
ня згінайся ў пояс бядзе.
Беларусь—не стаячае балота,
у Беларусі—ня ў ціхай вадзе!

Выходзь з падвалаў падпольля
на вольны, здабыты ўжо шлях.
Уздыхне размахам прывольля
Беларусі Заходняй зямля.

Селянін—выходзь з сякерай,
рабочы—молат бяры.
Узламайце скаваныя дзьверы—
там чырвань новай зары.

Уздымайце агнём завіруху
у полымі згіне прыгон.
Гэй, бедната, слухай!
— б'юць званы новых дзён!

Голас змаўкае. Паяўляецца сьвет. Сасоньнік. На ўзгорку сядзяць вясковыя хлопцы. У нізе палае вогнішча—касьцёр. Высокі стройны хлапец—Ігнат, з чорствым, але выразным тварам—ён атаман моладзі.

Ігнат

І так хлопцы толькі сьмела,
празьвініць і наш удар.
Панаваньне банды белай
зьнясе агонь—нібы вада.

Ня вечна плакаць за сахою,
ня вечна нам цярпець прыгон.
Ім незраўняцца з сілай маладою,—
а гэтай сілы—не адзін мільён.

Сонца кроўю налілося,
над голай вёскаю—,
як жырны пан дрыжыць.
Там! На Меншчыне—
зьвіняць калосься,
у нас дзе глянь—
адны крыжы.

2-гі хлапец

Ты працуеш, пот ліецца,
пан здаволены сьмяецца,
раптам штось неспадабае
і цябе тут—сына працы
зазаве ў свае палацы
бізуном цябе зьбівае,
сябе й жонку забаўляе...

Ігнат

Так, браты, крывавыя забавы,
такіх забаў даўно ня бачыў сьвет...
Услухайся, гудуць сталетнія дубравы
дый маладняк гудзіць—да барацьбы заве.
Не! Не ўстаяць ім перад сілай працы!
Не абароніць іх «усемагутны бог».
Прыгнечаныя ўсе на дэманстрацыю—
На апошні—сьмела ў бой!
Прыдзе к нам дзень новага жыцьця,
і ўтворыць новую вялікую пару,
ўзьвіецца наш—чырвоны сьцяг,
і аб'яднае Беларусь!

3-ці хлапец

Калісьці казкі нам казалі,
што пан людзей кідаў на гандаль.
Цяпер мы гэта самі бачым—
гандлюе намі паноў банда.

Ігнат

Ты, Якім, уладзь з аружжам,
заўтра ўздрогнецца зямля!

4-ты хлапец

Калі праца пойдзе дружна!

3-ці хлапец

Барацьбе шырэкі шлях!

Ігнат

Заўтра па ўсёй Беларусі
ўсе, як адзін атрад.

2-гі хлапец

Пачынаюць!

Ігнат

І ў гэтай завірусе
нам трэба ўсё, што ёсьць забраць...

4-ты хлапец

Калі сяляне пойдуць з намі...

2-гі хлапец

Сяляне будуць!

Галасы

Пераможам!

4-ты хлапец

Няхай жыве чырвоны сьцяг!

3-ці хлапец

Беларусь ім ня стрыножыць!

4-ты хлапец

Выйдзем!

2-гі хлапец

На пераможны шлях!

Ігнат

У нас яшчэ адно пытаньне,
дзе назначыць заўтра збор?

3-ці хлапец

Заўтра збор у нас ня ў тайне,
дык спаткацца ля Трох-Гор.

Ігнат

І адтуль, сабраўшы сілу,
Толькі сьмела!

3-ці хлапец

Ня спужаць!

4-ты хлапец

Возьмем пана мы на вілы!

2-гі хлапец.

Ой, усыпем «дваццаць пяць»!

Сьвет зьнікае... паступова паяўляецца зной.

* * *

Той-жа сасоньнік. Сонца кідаецца ўвечар. На ўзгорку сядзіць панскі пастух Тадэуш, а ля яго ў зяляніне сьпіць няпрытомны селянін. Тадэуш уваабраны пастуховымі прыладамі.

Тадэуш

(Глядзіць на селяніна)

Сьпіць бядак... Такая наша доля!..
Ня змог ліхой бяды стрываць!
«Канаркі» яго сына шомпалам餘 паролі
язык скрывавілі і змусілі сьпяваць.
Пасьля паапякамі маладыя пяты:
—ну, танцуй, хлопаку--той раве ў іспуг..,
Ой ня раз паляк дый прыкладам катнуў,
Ня стрымаў--ня вынес--выпусьціў свой дух.
Бацька змучаны, ну вось і стаў вар'ятам,
як ляеун блукае ў гэтым вось ляску.
Жалю ня было-б каб быў ён пан багаты—
ды адна-ж галота, вецер у таку.

Селянін

(З прасоньня)

О, не-не-не! Яго вы не забілі,
ён сам, ён сам памерці захацеў...

Тадэуш

Заўчора і каваль ад панскае прынукі
пабіты, змучаны у хату прыдыбаў.
І ўвечары злажыў худыя свае рукі —
а дужы быў, і ўсёткі ня стрымаў.
Адно вось моладзь з чырвані і стужкі
узьдзене кажучы—для новага жыцьця...
Паніч аднойчы мне: «лаві ты іх, як птушак,
і станеш мне, як роднае дзіця.

Але стары я ўжо, а ўсёткі сэрца маю,
і здраднікам з пракон вякоў ня быў!..
Цяпер ужо і песень не сьпяваеш,
ня любы мае і крык маёй трубы..

(Паглядае на Захад)

Э-э... тут ўжо і сонца за гару сядае...

(Устае)

Паганю скаціну... хай паўзе дамоў...
А ў вёсцы пэўна навіна чакае,
ня было і дня каб ня лілася кроў.
О, крывавыя паны разводзяць штукі
каб рассказаць—ня стане ў сэрцы слоў:
Гарачае жалеза суне табе ў рукі,
тут табе дзяўчына і гуляй ў любоў...

(Ківаючы галавой ідзе на байдан).

*

Трымаючыся за рукі ўваходзяць паніч Людовік і яго паненка Марына.

Людовік

Вось толькі тут,
вось толькі тут з табою
я чую, як ніколі, спакайцей сябе...
Прыгожы кут!
У вечным супакоі
лявольна забываешся аб дзікай барацьбе.

Марына

(Упіваючыся захадам сонца).

Якое хараство, павольна дзень зьнікае,
Людовік, глянь, які цудоўны ўзор.

Людовік

(Нібы злосна)

Заўсёды ўвечары на наўкола паглядае
хамства адзічэлае, выходзячы на двор.
Хадзем Марына, сядзем тут на ўзгорку,
будзем выглядаць, як месяц усплыве...
Разам адшукаем свайго шчасьця зорку.

Марына

Разам будзем слухаць як стары бор пяе...

Людовік.

Разам, толькі разам, праз усе хвіліны нашых дзён!

Марына

Ці будзе толькі час?

Людовік

Будзе і вялікі! О, мая Марына,
слугі верныя дадуць нам, праца іх для нас?

Марына

Ты надзвычайна дзіўны, пэўны ўжо праз меру

Людовік

Думаеш, што шчасьця разаб'юць нам басякі?

(Працяг будзе).

---

*) **Ад рэдакцыі.**

Поэма «Паўстанцы» напісана аўтарам формай драматычнага твору. Асаблівых труднасьцяў і затрат для пастаноўкі ня трэба. Поэма малюе барацьбу працоўнай моладзі Заходняй Беларусі з панамі і імкненьне як найхутчэй злучыцца з вызваленай Кастрычнікам савецкай Беларусьсю.

Раім драм-гурткам для пастаноўкі ў дзень астрычніка.

КОМСАМОЛЬЦЫ БЕЛАРУСІ БУДУЮЦЬ НОВУЮ ВЁСКУ.

У ДНІ ДЗЕСЯЦІГОДЗЬДЗЯ КАСТРЫЧНІКА І ЎРАДЖАЙНАГА СЬВЯТА ПАДМАЦУЕМ ГЭТА ФАКТАМІ

СВАЕЧАСОВА ПАДРЫХТУЕМСЯ, КАБ ПОУНАСЬЦЮ ПРАДЭМАНСТРАВАЦЬ НАШЫ ДАСЯГНЕНЬНІ Ў СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ.

КОМСАМОЛЬСКІЯ ЯЧЭЙКІ, ХАТЫ-ЧЫТАЛЬНІ, СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫЯ ГУРТКІ,— НАКОЛЬКІ ПАДРЫХТАВАЛІСЯ ВЫ ДА ВЯЛІКАГА ЮБІЛЕЮ?

Сялянскія вопытныя пасевы.

Навука на сялянскіх нівах.

Жадаючы павялічыць прыбытковасьць сваёй гаспадаркі, селянін павінен раней за ўсё зьвярнуць увагу на свой **пасеўны матар'ял**. Вялікую ролю іграе тут **сартаваньне зерня**, але яшчэ большае значэньне мае **правільны выбар сорту**. Атрыманыя вопытнымі станцыямі сэлекцыйныя сарты больш **ураджайны**, чым мясцовыя сялянскія, а апрача таго яны дадуць прадукт больш высокі **па якасьці**, што таксама мае вялікае значэньне. Але кожная мясцовасьць праяўляе свае патрабаваньні да сорту: адзін раён патрабуе **засухатрывалых** сартоў, другі, наадварот, патрабуе сартоў, якія **прыстасаваны да дажджлівага, халоднага надвор'я** і г. д.

У 1926 годзе **Аддзел Гэнэтыкі і Сэлекцыі Ўсесаюзнага Інстытуту прыкладной Батанікі і Новых Культур** пачаў работу па дасьледваньню сэлекцыйных сартоў у сялянскіх гаспадарках. Гета праца павінна пазнаёміць селяніна з палепшанымі сартамі палявых расьлін, а таксама выявіць годнасьць гэтых сартоў ва ўмовах сялянскай гаспадаркі. Сялянам, якія пажадалі прыняць удзел у вопытах, **высылалася бясплатна сэлекцыйнае насеньне. Разам з насеньнем высылалася настаўленьне аб пасеву і апытальныя лісты для запісі нагляданьняў.**

У бягучым 1927 годзе сетка сялянскіх вопытных пасеваў значна пашырылася. У вопытах прымаюць удзел больш трох тысяч перадавых сялян-вопытнікаў. Разаслана каля **4.500** пасылак з сэлекцыйнымі насеньнямі. Вопытамі ахоплен ўвесь поўнач СССР, а іменна: **Беларуская ССР, Аўтаномная Карэльская ССР, Аўтаномная вобласьць Комі, Архангэльская, Валагодзкая, Паўночна-Дзьвінская, Ленінградзкая, Ноўгародзкая, Чэрапавецкая і Пскоўская губэрні.**

Зараз часткова ўжо зроблены зьняцьці ўраджаяў, а частку яшчэ толькі праводзяць. Надзвычайна важна, каб асобы, якія праводзілі вопыты па параўнаньню сартоў, давялі-б іх да канца і дасканала падлічылі ўраджай.

Нават, калі вопыт па якой-небудзь прычыне і ня ўдаўся (напрыклад: пасеў быў пабіт градам, страўлен жывёлаю, пацярпеў ад засухі ці ад лішкі вільгаці)— апытальныя лісты ўсё-ж неабходна накіраваць у Аддзел Гэнэтыкі і Сэлекцыі, адзначыўшы ў іх прычыны няўдачы вопытаў. Лісты павінны быць накіраваны у Аддзел не пазьней 1 сьнежня гэтага году.

Тыя, хто ўважліва і сумленна аднёсься да вопыту ў бягучым годзе, **могуць разьлічваць у будучым годзе атрымаць другі сорт ці другую культуру, калі своечасова паведамяць аб сваім жаданьні працягваць вопыты** Аддзел Гэнэтыкі і Сэлекцыі УІПБ і НК (**гор. Дзецкае Сяло**, Ленінградзкай губерні).

У будучым 1928 годзе вызначаны да рассылкі наступныя сарты: авёс «**Залатыя дождж**», ячмень «**Чырвонец**», палявы гарох **проф. Пісарава**, бульба «**Эпікур**», турнэпс «**Остэрзумдамскі**» «**Бордфэльскі**», бручка «**Бангольн**», **жоўтая, швэцкая** і бурачкі «**Баррэс**». Магчыма, што будзе таксама рассылацца азімае жыта «**Вятка**».

М. Беляеў.

Ад рэдакцыі: Мы горача раім комсамольцам, працуючым на вясковай гаспадарцы завязаць сувязь з гэтым інстытутам.

Навялі парадкі ў лесе.

(Жыліхоўскі сельсавет, Чырвона-Слабодзкі раён, Бабруйская акруга).

У сучасны момант па вёсках наглядаюцца выпадкі кражы лясоў мясцовага значэньня.

Гэта наглядалася і ў нас год таму назад. З часу перавыбараў сельсавету мы зьвярнулі ўвагу і на лясы мясцовага значэньня, што дало належныя вынікі.

Перш за ўсе **сельсаветам была вылучана камісія па вывучэньню становішча лясоў масцовага значэньня, і самае галоўнае--нам удалося выбраць комсамольцаў за ўпаўнаважаных лясамі мясцовага значэньня.**

Справа відавочна зьмянілася, калі лясы папалі пад комсамольскі нагляд.

Нядаўна сельсаветам была праробленa рэвізія лясоў мясцовага значэньня вёскі **Выгада**. Вось вынікі: **ахова лесу ўжо ўскладзена на ляснога вартаўніка, упаўнаважаным набыта кляймо, парубкі адсутнічаюць.**

Пры ўпаўнаважаных **створана леса-гаспадарчая камісія**, якая дапамагае весьці лясную гаспадарку.

У лесе наладжан добры парадак: **парубка адбываецца дзялянкамі, якія адводзіць лясьнік. Дзялянка мінулага году сёлета засеяна. Усякі буралом своечасова прыбіраецца. Распачалося нават ужо лесаўпарадкаваньне за сродкі сялян.**

Лес вызначаецца па патрэбнасьці, выяўленай леса-гаспадарчай камісіяй.

У гэтым годзе нам удалося збудаваць два масты і кузьню, на якія прышлося браць матар'ял з мясцовага лесу.

Да дзесяцігодзьдзя Кастрычнікавай рэволюцыі мы маем пралажыць па вёсцы тратуары, адшукаўшы матар'ял у лесе мясцовага значэньня.

Усе паказаныя дасягненьні мы маем таму, што ўзялі лес пад свой комсамольскі нагляд.

М. ШПІЛЕЎСКІ.

Кандыдаты ў культурнікі.

Што зрабілі „шакамяты“ за лета?

(Вільшчынская ШСМ).

Зьехаўшыся на вучобу ў ШСМ, нашы вучні сабраліся на конфэрэнцыю, дзе рабілі інформацыі аб сваёй працы ў летні час дома.

Болей 20 вучняў пасеялі ў сабе кораньплоды, якіх раней у вёсках і ня бачылі, а цяпер і сяляне некаторыя сеюць.

Каля 25 вучняў у бацькоў адваявалі градкі для гародніны: буракоў, капусты і інш. У каго лепш парасьце, у бацькі ці ў сына?

Адзін вучань агаварваецца—«спачатку ў бацькі лепей расло, а нарэшце мае перагналі».

У чым тут сакрэт? Зусім проста: бацька шкадаваў прарваць буракі, а я прапалоў, капусту садзіў рэдка, не даваў траве расьці, палоў грады, паліў разы два вадою, і бацька дзівіцца—«першы год гаспадарыць сынок, а парасло лепшае чым у мене».

15 вучняў заклалі ў сябе розныя папары: майскі, вікавы, чорны, бульбяны і інш.

Шмат вучняў пакуплялі мінэральныя ўгнаеньні і ўгаварвалі сялян купляць іх.

Насеньне амаль кожны вучань ачысьціў, і цяпер бацькі абяцаюць — «надалей кожны раз буду сеяць ачышчаным». Ды ня толькі бацькі, а і ўся вёска бачыць ад гэтага карысьць і будзе пераймаць у свае гаспадаркі.

Частка вучняў дома дагледзелі сады, перад ад'ездам у школу ўцяплілі хлявы для жывёлы, зрабілі кармушкі для кароў.

Адзін вучань летам організаваў малочнае таварыства. Вялі вучні працу ў сельска-гаспадарчых гуртках, праз якія дапамагалі сялянам парадамі, як палепшыць гаспадарку.

Цяпер кожны вучань рыхтуецца прывесьці экспонаты ка «Дню Ўраджаю» у школу на выстаўку.

М. Маркевіч.

Унутраны выгляд цёплага хлява з падлогаю, кармушкамі і вокнамі.

Выстаўка малочнай гаспадаркі.

(Ліст з Віцебску).

У пачатку лістапада гэтага году ў г. Віцебску адбудзецца выстаўка малочных прадуктаў.

Прыдаваючы вялікае значэньне разьвіцьцю малочнай гаспадаркі на Беларусі, нашы ўрадавыя органы адпушчаюць значныя сродкі для правядзеньня гэтай выстаўкі.

Выстаўка зьявіцца аглядам працы, якую вядуць саўгаспадаркі і арцелі ў галіне малочнай гаспадаркі,

Якая карысьць ад попелу.

(Латыгольскі сельсавет, Сямёнаўскі р., Віцебскай акругі)

Вельмі часта сяляне выкідаюць попел як непатрэбную рэч, куда-небудзь у яму. Большасьць яшчэ ня ведаюць, як карысьцен попел, як угнаеньне. У карысьці попелу я пераканаўся на уласным вопыце.

У 1925 годзе я сабраў **45 пудоў попелу** хаваў яго ў сухім месцы. Вясною мінулага году зрабіў вопыты. **Узяў дзьве дзялянкі зямлі па 20 квадр. сажняў кожны. Адзін з іх ўгноіў 8 фунтамі супэрфасфату, а на другі пасыпаў 30 фунтаў попелу. Абедзьве дзялянкі засадзіў бульбаю. Дзялянка, угноеная супэрфасфатам, дала 9 пуд. 32 фунты бульбы, а дзялянка з попелам—9 пудоў 25 фунтаў.**

Другі вопыт быў зроблен мною на сенажаці. **На дзесяціну лугу я высееў 40 пудоў попелу. Накасіў сена з гэтага кавалку 280 пудоў. Раней, да пасеву попялу гэта дзесяціна давала 90 пудоў сена. Значыцца, угнаеньне попелам і баранаваньне лугу павялічыла ураджай на 190 пудоў.**

К будучаму году я пастараюся сабраць яшчэ больш попелу, каб скарыстаць яго для угнаеньня.

Ф. Мурашка.

На сельска-гаспадарчай выстаўцы.

Пры раньнім папары будзем з хлебам.

(Пасёлак Зацішша, Гомельская акруга).

Я шмат чытаў ў газэтах і кніжках аб карысьці раньняга папару. Захацелася мне спрабаваць гэта ў сваёй гаспадарцы. **Бацька мой згадзіўся са мною зрабіць вопыт.**

Адзін загончык пад жыта мы ўзаралі ў маі. **На працягу лета яго пераворвалі, каб не зарастала травою. Да часу сяўбы жыта, зямля была рыхлая і чорная.** Ўсходы атрымаліся роўныя. Да жніва—бяз малага год, а ўжо відаць што жыта дасьць добры ўраджай.

А. Юркоў.

Рыхтуем гаспадароў-культурнікаў.

Пра „гарадзкі“ хлеб.

Толькі з восені мінулага году ў раённых комсамольскіх організацыях бышай Рэчыцкай акругі *) вызначыўся пералом у адносінах вясковых комсамольцаў занятых на сельскай гаспадарцы.

Ёсьць, праўда, і цяпер яшчэ комсамольцы, якія лічаць, што на **маленькай гаспадарцы нічога нельга зрабіць, на яе ўздым нявартa траціць і сілы, а лепш ісьці ў горад і шукаць сабе там працу.**

За апошнія, прыблізна, два гады, у комсамольскіх гаспадарках ёсьць шмат наочных дасягненьняў, якія апраўяргаюць погляды падобных таварышоў—«уцекачоў» з «цяжкага» вясковага хлеба—на «гарадзкі лёгкі».

„Па скарбе мы ходзім і яго ня бачым.

Комсамолец **Маканавіцкае** ячэйкі **Васілевіцкага** раёну зрабіў дацкую кармушку. Яна зьявілася штурхачом да гэтага другіх сялян. Комсамольцы гэтай ячэйкі ачысьцілі ўсё насеньне. Таксама адведзен **паказальны вучастак** для **рэалізацыі зімовай працы сельска-гаспадарчага гуртка.**

Комсамолец **Рабінок Антось** жыве ў гаспадарцы бацькі, але, **пад яго кіраўніцтвам, гаспадарка культурна паляпшаецца:** увёў лубін, сэрадэлю, канюшыну, турнэпс, ачыстку і пратраўліваньне насеньня і ўцяпленьне хлявоў. Тав. **Рабінок і актыўны, аўтарытэтны сярод сялян грамадзкі працаўнік: сябра сельсавету, сябра КСУД і старшыня крамнай камісіі коопэрацыі.**

Такі прыклад **дадатна адбіваецца** на вядзеньні гаспадарак іншымі сялянамі. Таксама гэты правераны факт разьбівае ўсякія погляды аб немажлівасьці злучаць грамадзкую працу з працай на сваёй гаспадарцы.

Прыкладаў культурнага паляпшэньня сваёй гаспадаркі па комсамольскіх ячэйках Беларусі—досыць шмат. Яны сьведчаць аб праламленьні лініі на конкрэтнасьць у працы комсамолу. Тут, праўда, трэба адзначыць тры моманты.

А „колектывізацыя“ толькі ў пастановах.

Прыклады культурнага паляпшэньня гаспадаркі больш адносяцца да **комсамольцаў-сераднякоў і менш усяго да комсамольцаў беднякоў.** Сярод апошніх ёсьць настроі аб немажлівасьці падняць маленькую гаспадарку на ўзровень гаспадаркі культурнай пры адсутнасьці патрэбных сродкаў.

З боку комсамолу **мала зьярталася ўвагі на дапамогу комсамольцу-бедняку ў падняцьці яго гаспадаркі.**

Амаль што зусім няма прыкладаў зацікаўленасьці і ініцыятывы комсамольцаў у справе **колектывізацыі сельскай гаспадаркі.** У гэтых адносінах і з боку організацый **ня было праведзена належнай працы. Сувязь з сельска-гаспадарчай крэдытнай коопэрацыяй і праца комсамолу ў ёй зусім слабая. Ініцыятыва асобных ячэек у організацыі малочнага ці машыннага таварыства пры першай няўдачы закідваецца на задні плян.**

Работа на сельскай гаспадарцы, якая праводзіцца комсамольцамі, **ячэйкамі не падлічваецца, не кантралюецца і не выпраўляюцца памылкі паасобных таварышоў.** Праўда, у адносінах кіраўніцтва можна заўважыць некаторы зрух. Райкомы сумесна з аграномамі пачынаюць праводзіць раённыя нарады комсамольцаў--самастойных гаспадароў, на якіх заслухоўваюцца даклады комсамольцаў аб тым, як яны вядуць сваю гаспадарку.

*) Матар'ял для гэтага артыкулу сабраны яшчэ да ліквідацыі Рэчыцкай акругі.

Зьвярні, браток, увагу на шчыліны ў хляве.

Заслугоўваюць увагі прыклады паасобных ячэек у справе кіраўніцтва комсамольцамі—самастойнымі гаспадарамі.

Вось выпіс з аднаго пратаколу бюро Валокскай ячэйкі ЛКСМБ, Хойніцкага раёну.

Слухалі: даклад тав. **Карася** аб вядзеньні сваёй гаспадаркі.

— «З часу майго пераходу на пасёлак, я пачаў культурна весьці сваю гаспадарку. Мінулай вясной я сеяў кораньплоды, турнэпс, але дзякуючы таму, што зямля ня была яшчэ падрыхтавана з восені, ураджай быў ня зусім добры. Практыкаваў угнаеньне поля калійнай сольлю. Вяду правільны васьміпольны севазварот. Засеяў два палі канюшынай, якая ў гэтым годзе парасла добрай. Мой бацька ў корні супроць васьміпольля, а я стараюся даказаць перавагу гэтай сыстэмы.

З наступнага году я пастараюся завесьці шацілаўскага аўсу. Сею заўсёды толькі ачышчаным насеньнем. З пераходам на зімовы парыад, я наладзіў кармушку, што было адобрана з боку бацькі».

Далей ідзе актыўнае абгаварваньне дакладу, пасьля чаго бюро выносіць пастанову, у якой адзначае: — **некаторыя культурныя пачынаньні ў гаспадарцы зроблены** (засеў канюшыны, правільны васьміпольны севазварот, сартаваньне насеньня, засеў кораньплодаў, уцяпленьне хлявоў, пабудаваньне кармушак) і тут-жа прапануе комсамольцу Карасю:

Устроіць сьвятло ў хляве; паставіць кароў на прывязь; абавязкова ачысьціць насеньне на наступны год; карміць жывёлу па норме; ува ўсёй працы трымаць цесную сувязь з аграномам; свае дасягненьні і вопыт папулярызаваць сярод сялян свайго пасёлку.

Праўда, такіх ячэек у нас яшчэ мала. Як-бы мы радаваліся, каб усе ячэйкі працавалі па мэтоду **Валокскай** ячэйкі, бо такое кіраўніцтва яшчэ узгодненае з аграномам, нам вельмі і вельмі патрэбна.

К. ВЕРАМЕЙЧЫК.

Менскі гарнізон вярнуўся з манэўраў

Рабочыя масы сустракаюць праходзячыя часьці.

Дождж... Дождж і туман засьцілаюць усё імглою. Але тысячы працоўных запоўнім вуліцы.

Нельга прайсьці. Людзкі натоўп хвалюецца. Сьцягі, оркестры і радасныя твары разганяюць црыкры дождж.

У руках белыя клумачкі. Рэдка ўбачыць каго бяз падарунка чырвонаармейцу.

6 гадзін. У горад уваходзіць пяхота. Наперадзе дэлегацыі рабочых. Дзесяткі сьцягаў.

Т. Лакціонаў і камандзіры з кветкамі ў руках. Чырвонаармейцы з клумачкамі.

На плошчы братаньне. Рабочыя раздаюць падарункі.

З балькона **ЦВК** вітае праходзячыя часьці начальнік N-скага кав. корпуса т. **Цімашэнка**, Наркамасьветы т. **Баліцкі** і іншыя.

Ідзе каманда **ТСААвіяхіму**. Нясецца коньніца. Едуць кулямётчыкі.

З балькона **ЦККП (б)Б** вітаюць т. т. **Сянкевіч, Абрамчук, Козюра** і інш.

Праносіцца кавалерыя. Цяжка папыхваючы едуць бранявікі.

Ля польскага консульства ўзмацнёны караўл міліцыі.

Апошняй зноў ідзе пяхота...

З песьнямі і факеламі разыходзяцца рабочыя.

Каліта.

Саюзныя навіны.

КОНФЭРЭНЦЫІ РАБОЧАЙ МОЛАДЗІ. Менакругком ЛКСМБ сумесна з ЦСПСБ склікае 15-га кастрычніка ў Менску і Барысаве агульна-гарадзкія конфэрэнцыі рабочай моладзі.

Парадак дню конфэрэнцый наступны: 1) Даклад аб 10-цігодзьдзі існаваньня Савецкай улады; 2) экономічна-адукацыйная работа сярод моладзі; 3) аб усебеларускім суботніку рабочай і сялянскай моладзі; 4) інформацыйны даклад аб мясцовым пляне сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя Кастрычніка.

Модус прадстаўніцтва на конфэрэнцыю па Менску—адзін дэлегат на 3 чал.

СХОДЫ СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ. У мэтах шырокага азнаямленьня сялянскай моладзі са зьместам надыходзячых Кастрычнікавых сьвят, а таксама растлумачэньня задач абароны краіны і гаспадарчага будаўніцтва, Менакругком прапанаваў усім вясковым РК правесьці конфэрэнцыі-сходы сялянскай моладзі ў межах сельсаветаў.

Гэтыя сходы павінны быць добра падрыхтаваны і праведзены не пазьней 20 кастрычніка.

УВАГА ПІОНЭРСКАМУ АГЛЯДУ! Бюро Менакругкому ЛКСМБ абмеркавала ход агляду піонэрорганізацыі ў акрузе.

Адзначана, што **АГЛЯДУ ПІОНЭРСКАЙ ОРГАНІЗАЦЫІ РАЙКОМЫ, ЯЧЭЙКІ І РАДАВАЯ КОМСАМОЛЬСКАЯ МАСА АДДАВАЛІ МАЛА ЎВАГІ І АМАЛЬ НІЧЫМ НЕ ДАПАМАГЛІ ЯГО ПРАВЯДЗЕНЬНЮ.**

АК абавязаў гарадзкія райкомы тэрмінова склікаць па пытаньню аб аглядзе нарады піонэр-актыву.

Дапамога палітвязьням.

За апошнія 6 месяцаў сярод МОПР'аўскіх організацый БССР сабрана 113 тысяч рублёў.

Усе гэтыя сродкі пераводзяцца Выканкому МОПР'у ў СССР на ўзмацненьне дапамогі палітвязьням.

На барацьбу з бяспрытульнасьцю.

Прэзыдыум Менакрвыканкому пастанавіў утварыць акруговы фонд дапамогі бяспрытульным дзецям у суме 15 тысяч руб.

Палова гэтых сродкаў асыгнуецца па мясцоваму бюджэту на 1927-28 год, астатняя частка ўносіцца грамадзкімі організацыямі (таварыства „Прыхільнік дзяцей") і інш.

Паход на балоты.

Згодна вестак Наркамзему, у 1927-28 годзе будзе асушана на тэрыторыі БССР 24.000 гэктараў балотнай зямлі.

На работы па асушцы асыгнуецца з дзяржаўнага бюджэту звыш 1.000.000 рубл.

„Стары Менск".

Пры Белдзяржмузэі адчыніўся цікавы аддзел пад назвай **„Стары Менск"**. У ім сабраны помнікі Менскай старыны.

З экспонатаў трэба адзначыць старынныя Менскія граматы, гравюры, бытавыя прыналежнасьці менскіх жыхароў 17 і 18 стагодзьдзяў і г. д.

Самалёт „Дзяржынскі".

Сярод польскага насельніцтва БССР зараз праводзіцца інтэнсыўная кампанія па збору сродкаў на самалёт **„Фэлікс Дзяржынскі"**.

Ужо сабрана звыш 1000 руб.

Білеты лётарэі „АЗЕТ" раскупаюцца.

Беларускі камітэт „АЗЕТ" атрымаў з Масквы дзеля распаўсюджваньня па тэрыторыі БССР **100.000 білетаў усесаюзнай АЗЕТ—лётарэі.**

З гэтай колькасьці па Менскай акрузе прызначана да рэалізацыі 50.000 білетаў.

Покуль што прадана каля 5000 біл.

Батракі ідуць вучыцца.

У гэтым годзе батрацтва праявіла асабліва вялікую цягу да вучобы. На рабфакі БССР паслана 91 батрак, у с-г. тэхнікумы—15 чалавек, лясныя школы—20 чалавек і школы сялянскай моладзі каля 100 чалавек.

36 батракоў паступіла на вучобу ў Горацкую Акадэмію і 5 батракоў у сельска-гаспадарчыя ВНУ РСФСР.

На лесарубчыя работы.

У 1926-27 г. на лесараспрацоўках Беларусі было занята 60 тысяч чалавек. З іх толькі 10 проц. складалі члены саюзу Рабзямлес.

Сёлета на лесараспрацоўкі будуць пасылацца ў першую чаргу беспрацоўныя члены саюзу Рабзямлес.

У тры радкі.

— У пачатку кастрычніка пачнецца **кампанія перавыбараў бюро ячэек МОПР'у** па Менскай акрузе.

— На організацыю **ўсебеларускай малочнай выстаўкі** адпушчаецца 5000 рублёў.

— Галоўная ашчадная каса разьмяркоўвае сярод сваіх актыўных укладчыкаў **250 капілак.**

— Кіраўніцтва Асінастрою атрымала **40.000 рублёў на пабудову Выдрыцкага шосэ.**

— **На ўсебеларускі зьезд профсаюзаў** чакаецца з месц **300 дэлегатаў рабочых.**

У Менскай акрузе **будуецца некалькі новых млыноў**, на што адпушчана каля 20 тысяч рублёў.

— Наркампрацы абвясьціў **новы набор на курсы перакваліфікацыі настаўніцтна.**

— **На 150 тысяч рублёў лесу будзе сёлета дармова адпушчана бяднейшаму сялянству Менскай акругі.**

КАСТРЫЧНІК ІДЗЕ.

Інстытут Соцыяльнай Гігіены.

Заканчваецца абсталяваньне Інстытуту Соцыяльнай Гігіены пры Наркамахове Здароўя БССР, які будзе адчынен да 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі.

Пры інстытуце ўтвораны аддзелы: санітарна-тэхнічны, прамысловай гігіены, водны і харчовы. У Інстытут пераводзіцца кафэдра агульнай гігіены Мэдфаку БДУ.

500 новых тэлефонаў.

Зараз на Менскай тэлефоннай станцыі адбываецца капітальнае пераабсталяваньне, якое будзе скончана да 10-й гадавіны Кастрычніка.

У выніку пераабсталяваньня па гораду будзе ўстаноўлена 500 новых тэлефонаў, наладжана сталая тэлефонная сувязь з іншымі гарадамі і інш.

Унівэрсытэт рыхтуецца.

Праўленьне БДУ праводзіць дзейную падрыхтоўку да сьвяткаваньня 10-й гадавіны Кастрычніка, якое супадае з 6-й гадавінай яго існаваньня.

У дні сьвята адбудзецца закладка унівэрсытэцкага гарадку, выпуск 170 чырвоных дактароў, скончыўшых Мэдфак, адчыненьне унівэрсытэцкага кіно і організацыя аддзелу Кастрычнікавай рэволюцыі пры габінэце Марксызму і Ленінізму.

Абвешчан конкурс на лепшы літаратурны нарыс з унівэрсытэцкага жыцьця і прыкладны пакой у студэнцкім інтэрнаце.

„Ільліч" і „Кастрычнік".

Да 10-й гадавіны Кастрычніка ВСНГ пушчае ў ход капітальна-адрамантаваныя шкляныя заводы **„Ільліч" і „Кастрычнік"**.

На ўсіх прадпрыемствах ВСНГ будуць адчынены вытворчыя выстаўкі.

Новы фармацэўтычны завод.

Белменгандаль вызначыў пабудаваць на Унівэрсытэцкай вуліцы новы фармацэўтычны завод, які задаволіць патрэбы ўсіх аптэк, амбуляторый і лячэбніц БССР ў неабходных мэдыкамэнтах.

Увесь завод будзе мэханізаваны, пабудова яго будзе каштаваць 180 тысяч руб.

Закладка прыстасоўваецца да Кастрычнікавых дзён.

Выстаўка дзіцячай самадзейнасьці.

Да 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі рэдакцыя газэты „Дэр Юнгэр Піонэр" наладжвае ўсебеларускую выстаўку дзіцячай самадзейнасьці.

На выстаўцы будуць прадстаўлены малюнкі, скульптура, рукадзельле і інш. галіны дзіцячай творчасьці.

Піонэры—шофэры.

На адбыўшыхся 18-га верасьня ў Маскве аўтамабільных гонках удзельнічалі таксама два юныя піонэры.

На здымку - удзельнікі—піонэры ў сваім аўтамабілі перад адпраўкай.

№ 6 Шахматы і шашкі № 6

Пад рэдакцыяй П. Ліпкінда

Задача № 7.

Малкеса (Менск).



Белыя: Крg8, Фе8, Ке5, Кg5, пп: b3, b5, e2, h2... (8)

Мат у 3 хады

Эцюд № 2.

Левіна І. (Барысаў).



Белыя пп: a2, e1, e3, e5, f2, g3, h2...7

Чорныя пп: a5, a7, b6, c5, c2, g7...6.

Белыя выйграваюць

Матч Капабланка—Алёхін.

У Буэнос-Айросе (Аргентына) 15 верасня г.г. пачаўся матч на пяршынство сьвету паміж **Капабланкай і Алёхіным**. Іграюць яны да 6 выйграных партый, бяз нічыіх.

Першая партыя скончылася перамогай Алёхіна, другая сыграна ў нічыю, а трэцяя—скончылася ўжо перамогай Капабланкі.

Гэту, лепшую з сыграных у матчы партый, мы зьмяшчаем з падрабязнымі заўвагамі. Чацьвертая і пятая партыі матча скончыліся ў нічыю.

Трэцяя партыя матчу.

Капабланка (белыя)	Алёхін (чорныя)	Капабланка (белыя)	Алёхін (чорныя)
1. d4	Кf6	22. e3	Фа4
2. Кf3	b6	23. Ф:d5	Лс2
3. g3	Сb7	24. Лd2	Л:а2
4. Сg2	c5	25. Л:а2	Ф:а2
5. 0-0	С:d1)	26. Фс6	Лf8
6. К:d4	С:d2	27. Кd4	Крh8
7. Кр:g2	d5	28. Се5!!6)	f6
8. c4!	e62)	29. Ке6	Лg8
9. Фа4+	Фd73)	30. Сd47)	h6
10. Кb5	Кс6	31. h4!	Фb1
11. С:d	e:d	32. К:g7!	Фg68)
12. Сf4	Лс8	33. h5	Фf7
13. Лс1	Сс54)	34. Кf5	Крh7
14. b4!	С:b4	35. Фе4	Ле8
15. Л:с6	Л:с6	36. Фf4	Фf8
16. Ф:b4	Ке4	37. Кd6	Ле7
17. Кd2	К:d2	38. С:f6	Фа8+
18. Ф:d2	0-0	39. e4	Лg7
19. Лd1	Лс5	40 С:g7	Кр:g7
20. Кd4	Лс8	41. Кf5+	Крf7
21. Кb35)	Лсс8	42. Фе7+ і наступным ходам—мат	

Заўвагі:

1) Лепей быў-бы ход d6 з далейшым разьвіцьцём пры дапамозе e6 і С е7.

2) Лепей было-б пабіць на с4, бо тут акрамя таго, што пешка d5 застаецца слабай, адчыняецца дыяганаль а8—h1 для шаха пры выпадку.

3) Не 9... К b d7, бо 10 Кс6 Фс8 11. Сf4—і ў чорных мала добрых хадоў для разьвіцьця сваіх фігур.

4) Тут лепей было-б згуляць 13... Ке4! і на 14 Кс7+Л:с7 15 с:с7 Кс5; з зусім добрым становішчам.

5) Капабланка, пасьля таго, як опэрацыя на фэрзявым баку дала яму матэрыяльную пераваГу (слана і каня за ладзьдзю і слабую пешку) пераносіць атаку на каралеўскі бок. Гэты ход зьяўляецца пачаткам новай опэрацыі.

6) Гэты, на від не небясьпечны ход зьяўляецца тым самым руйнуючым крокам, дзякуючы якому белыя далі магчымасьць чорным палучыць дзьве пешкі на фэрзявым баку. Цяпер белыя пагражаюць С:g7!! і на Кр:g7 згуляюць К f5+ з наступным Фf6.

7) Надрыхтоўваючы К:g7!

8) Вымушана. Калі Кр:g7?—тады Ф:f6 і мат праз 2 хады. На Л:g7 таксама Ф:f6—і выйгрыш.

Усю партыю Капабланка правеў вельмі энэргічна, балансіруючы ферзем, сланом і канём на каралеўскім флянге.

Усесаюзны шахматна-шашачны зьезд.

Адчыніўся V зьезд вялікім усесаюзным чэмпіянатам, у якім прымаюць удзел, акрамя старых ігракоў, і маладыя чэмпіёны.

Сьпіс удзельнікаў чэмпіянату наступны: 1. Рабіновіч, 2. Бацьвінік, 3. Пэрфілеў; 4. Макагонаў, 5. Раманоўскі; 6. Вільнер; 7. Касьперскі; 8. Дуз-Хацімірскі; 9. Ненарокаў; 10. Ільлін-Жэнеўскі; 11. Паўлаў-Пянаў; 12. Багатырчук; 13. Халадкевіч; 14. Фрэйман; 15. Сяргееў; 16. Грыгор'еў; 17. Раўзэр; 18. Рохлін; 19. Смароцкі; 20. Модэль.

І-ы тур.

У першым туры **Модэль** выйграў у **Бацьвініка, Макагонаў** у **Смароцкага, Вільнер** у **Рохліна.** У нічыю згулялі: Касьперскі БССР з Грыгор'явым і **Ненарокаў** з **Фрэйманым.** Астатнія партыі адкладзены.

2-гі тур.

У 2-м туры малады ленінградзкі чэмпіён **Бацьвінік** вельмі цікавай камбінацыяй выйграў у маэстра **Вільнера. Рамаўскі** выйграў у **Смароцкага, Ільлін-Жэнеўскі** у **Фрэймана, Касьперскі** прайграў маладому Украінскаму чэмпіёну **Раўзэру, Модэль** выйграў у Перфілява і **Сяргееў** прайграў **Ненарокаву.** Партыя Грыгор'еў-Дуз сыграна у нічыю. Партыі **Сельнеў**—Макагонаў і **Халадкевіч—Паўлаў**—ня скончаны. 30-га верасьня з Менску выехала ў Маскву на ўсесаюзныя шахматныя камандныя спаборніцтвы беларуская каманда ў складзе т.т. **Блюмберга** (Менск), **Сташэўскі** (Магілёў), **Маневіч** (Гомель), **Сіліч** (Віцебск), і **Шукевіч-Трацьякоў** (Менск). Кандыдатамі паехалі **Тышлер** (Віцебск) і **Лапідус** (Менск).

Куды пайсьці.

Сёньня ў Белдзяржтэатры пачынаюцца гастролі дзяржаўнага яўрэйскага камэрнага тэатру пад кіраўніцтвам **Граноўскага.** Сеньня і заўтра пойдзе—**„Трудадэк".** У галоўнай ролі артысты **Міхоэльс.**

Новыя кіно-фільмы.

Гэтымі днямі Белдзяржкіно выпушчае на Менскія кіно-экраны наступныя фільмы: **«Белла»** (па Лермантаву), **«Смарагда Набурэн», «Мабул»** (па Шолам Алэйхему) і **„Віхор"** (з удзелам вядомай Эгдэ Нісэн).

Адказы чытачам.

Мэлікаву. (№ 1096). Замест антэнны ўжываць электрычную сетку можна. Толькі праводку трэба рабіць вельмі асьцярожна. Лепей ўсяго для гэтай мэты выклікаць тэхніка.

П. С—ву. (№ 1097). Вэтэрынарная лячэбніца ў Менску ёсьць. Яе адрас—вул. Пуліхава, № 1.

Сормаву. (№ 1098). Спэцыяльнай бальніцы для эпілепсікаў у Менску няма. Звараціся ў нэрвовую клініку.

Яму-ж. (№ 1098). Аб кепскай працы раённага лекара трэба паведаміць акруговы камітэт аховы здароўя.

На хвалі 500 мэтраў.

(Менская радыё-станцыя імя Саўнаркому БССР).

Сёньня перадаецца наступная праграма:—7 г. 00 хв.—Радыё-газэта «Чырвоная Зьмена»; 7 30—**Радыё-газэта № 168**; 8.15.—Гутарка ТСА-Авіяхіму—**„Танкі і барацьба з імі"**; 8.45—Даклад ЦК ЛКСМБ **„Удзел КСМ у Кастрычнікавым сьвяце"**; 9.15 **Вечар танцаў.**

Заўтра перадаецца:—6 г. 00 хв.—**„Бязбожнік"** па радыё; 6.30 хв.—**„Беларуская Вёска"** па радыё (з польскім аддзелам); 7 г. 15 хв.—Гутарка ВСФКБ—**„Вынікі ўсебеларускай фізкультурнай спартакіяды"**; 7 г. 45 хв.—**„Навіны радыё"** па радыё; 8 г. 15 хв.—**Концэрт ці трансьляцыя.**

У панядзелак будзе перадава:—7 г. 00 хв.—Гутарка па радыё-тэхніцы—**„Электрычныя калябаньні"**; 7.30—**Радыё-газэта № 169**; 8 г 15 хв.—Гутарка АК КП(б)Б—**«Што даў Кастрычнік рабочым і сялянам»**; 8.45—**Концэрт.**

ЗГУБЛЕНЫ.

— Комсамольскі білет за № 115 на імя Віхнес, выдадзены Менакругкомам ЛКСМБ.

— Комсамольскі білет за № 8138, на імя **Гайдукевіча Уладзімера**, выдадзены Менакругкомам ЛКСМБ.

— Комсамольскі білет за № 849 на імя КАЖДАНА, выдадзены Менакругкомам ЛКСМБ.

НАВУКА І ЖЫЦЬЦЁ.

Загадка паштовых галубоў.

Усім вядома важнае значэньне службы галубоў у ваеннай справе.

У СССР ня раз ужо праводзіліся масьпяховыя спаборніцтвы галубоў на дальнасьць і дасканаласьць іх палёту.

Спаборніцтвы давалі дзіўныя вынікі: галубы, выпушчаныя ноччу за 300-400 кілёмэтраў ад месца сваёй базы, безпамылкова праз 2-3 гадзіны зварочваліся ў яе.

Зьявішча гэта ўяўляе зараз самую цёмную і загадачную з старонак навукі аб жывёлах. Як растлумачыць, на самай справе, магчымасьць падобнай орыентыроўкі ў прасторы жывёл, якія адарваны ад сваіх гнёздаў на сотні кілёмэтраў, і якія, зразумела, ня могуць ні бачыць, ні абаняць гэтых гнёздаў.

У сучасны момант мала-па-малу пачынае праясьняцца гэтая загадка прыроды.

Галубаводы—аматары прыкмецілі, што ў гадзіны, так званых магнітных бур, на зямлі, калі магнітная стрэлка дрыжыць і хістаецца ў розныя бакі,—**галубы пачынаюць блытаць і губляць напрамак палёту!**

Ня менш дзіўнымі былі і назіраньні палёту галубоў недалёка ад радыё-станцый. Лётаючы ў паветры, у якім расплываюцца радыё-хвалі, галубы таксама пачыналі бездапаможна блытаць. Яны вялі сабе так, як калі-б радыё-сыгналы на справе ўспрымаліся галубамі і адцягвалі іх ад якіхсьці іншых электрычных сыгналаў, якія ім служаць вехамі ў палёце.

Гэтыя, і шэраг іншых падобных назіраньняў і фактаў—і, дазваляюць, у сучасны момант, пабудаваць тэорыю палёту галубоў.

Як дагадваецца ўжо чытач, прычына беспамылковай орыентыроўкі паштовых галубоў у паветры заключаецца ў якімсьці «шостым пачуцьці», якое магчыма было-б назваць **электрычным пачуцьцем жывёл.**

Справа ў тым, што акрамя электрычнасьці, якая здабываецца чалавекам на зямной паверхні, ва ўсёй атмосфэры, якая агартае зямную кулю, знаходзіцца **прыродная электрычнасьць.** Гэтая электрычнасьць, як вядома, праяўляецца ў выглядзе маланак і навальніц. Напруджанасьць электрычнай і магнітнай сілы існуе ў кожным пункце атмасфэры, прычым недалёка ад зямлі напруджанасьць гэта бяссупынна зьмяняецца, у залежнасьці ад характару мясцовасьці: узвышшаў, лесу і г. д. Вось гэтыя зьмены электрычнай напруджанасьці і ўлаўліваюцца з надзвычайнай вастратой многімі жывёламі, у тым ліку і галубамі.

Паўстае пытаньне: якім-жа органам успрымаюцца жывёламі гэтыя электрычныя сыгналы? Навуковыя дасьледваньні дазваляюць думаць, што гэтымі органамі зьяўляюцца так-званыя палукружныя каналы вуха—багатая нэрвамі поласьць чэрапу, роля якой да гэтых пор прадстаўлялася незразумелай для навукі. Калі гэтая думка правільная, дык, акрамя «слыхавога вуха» усе жывёлы (а некаторыя з іх у асаблівасьці) ўладаюць і „электрычным вухам", якое можа распазнаваць і запамінаць кожны кавалак зямлі, па ступені напруджанасьці, не далёка ад яе, атмосфэрнай электрычнасьці.

Становіцца зразумелым тады ўплыў магнітных бур і радыё-хваляў, якія блытаюць орыентыровачную здольнасьць галубоў.

Пацалункі і хвароба.

У Парыжы існуе **„анты-пацалункавая ліга"**, якая абвясьціла вайну пацалункам, так як з кожным пацалункам ад адных вуснаў да другіх можа перадацца, быццам-бы, да 40 тысяч мікробаў. Нават амэрыканцам, якія, як вядома, любяць вялікія лічбы, гэтая цыфра паказалася падазронай, і амэрыканскі часопіс **„Веды і вынаходжаньні"** даручыў бактэрыялёгічнай лабараторыі праверыць гэта зацьверджаньне французаў. Ад аднаго пацалунку жаночых губ на рэактыўны пласток бактэрыялёга ў сярэднім пападала 534 розных зародышаў хваробаў; калі губы былі накрашаны губнаю фарбай, дык колькасьць заразных мікробаў падымалася да 707 колёній. Сярод знойдзеных мікроорганізмаў было шмат узбудзіцеляў розных хваробаў.

Каучукавая лодка.

Італьянскае ваеннае міністэрства ўводзіць у свае вайсковыя часткі орыгінальныя лодкі, якія прызначаюцца для дзейнічаньня па рэках.

Яна ўяўляе з сябе **маленькі чамаданчык.** Чамаданчык ператвараецца ў лодку лёгка і хутка: ён мае звычайны вэлёсыпэдны насос, які ў 8 хвілін дастаткова поўна накачвае яе паветрам.

Увесь остаў гэтай лодкі падзелен унутранымі непраніпаемымі для вады перагародкамі на некалькі частак, што дазваляе лодцы трымацца на вадзе нават у тым выпадку, калі адна трэць гэтых памяшканьняў будзе прастрэлена і заліта вадой

Адказныя рэдактары { А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.